Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина
МОСКВА 19 УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14 ВСЕСОЮЗНОЙ БИБЛИОТЕКИ ИМ. ЛЕНИНА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 115 (5789) | 21 мая 1937 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Шырока разгарнуць профсаюзную дэмакратыю.

Гаеў — Па-большэвіцку падрыхтаваць да тыража пазыкі

А. Г. Славін — Планаваць рамонт жыллёвай гаспадаркі.

АБ ДВАЦЦАЦІПЯЦІГОДДЗІ «ПРАВДЫ» І ЗАДАЧАХ ДРУКУ—З даклада тав. Б. М. Таля на агульнамаскоўскім сходзе работнікаў друку і рабселькораў.

Ход сяўбы яравых па СССР.

На партыйных канферэнцыях.

ЗА РУБЯЖОМ:

Урад перамогі;

Іспанскі народ падтрымлівае ўрад Негрына;

Пахабная выхадка японскіх шпіёнаў;

Патрабаванні неадкладнай адстаўкі ўрада Хаясі;

Гутаркі тав. Літвінава з Блюмам і Дэльбосам.

ШЫРОКА РАЗГАРНУЦЬ ПРОФСАЮЗНУЮ ДЭМАКРАТЫЮ

Публікуемыя сёння пастановы VI пленума ВЦСПС аб арганізацыі выбараў профсаюзных органаў і аб праекце тыповага статута прафесіянальнага саюза — дакументы выключна вялікага значэння. Пастановы пленума ВЦСПС адкрываюць новую старонку ў совецкім прафесіянальным руху і даюць канкрэтную праграму дэмакратызацыі своеасаблівага крызіса профсаюзаў, які заключаецца ў адрыве іх кіруючых органаў ад мас, у адставанні профсаюзных дзеячоў ад шырокага размаху сацыялістычнага будаўніцтва і ад палітычнага росту рабочага класа.

Сіла партыі большэвікоў заўсёды заключалася ў тым, што яна магла бязлітосна выкрываць свае памылкі і недахопы. Пятнаццаць год таму назад, выступаючы на XI з'ездзе партыі, Ленін гаварыў: «Усе рэвалюцыйныя партыі, якія ў свой час гінулі, — гінулі ад таго, што зазнаваліся і не ўмелі бачыць, у чым іх сіла, і баяліся гаварыць пра свае слабасці. А мы не загінем, таму што не баімся гаварыць аб сваіх слабасцях, і навучымся перамагаць слабасці».

Профсаюзы абавязаны рашуча палепшыць выхаваўчую работу, дапамагаць удзелам рабочых і служачых авалодваць марксізмам. А правільнага выхавання не можа быць без разгорнутай, самаўдзенай самакрытыкі. Іменна гэтага не ставяць пакуль профсаюзы!

Важнейшае значэнне своечасовага пленума ВЦСПС заключаецца ў тым, што ён дапаможа Цэнтральнага Камітэта партыі — разгарнуць вострую крытыку недахопаў і памылак, дапушчаных кіраўнікамі профруху. Як весняная навальніца змывае грязь вулі і ачышчае паветра, так разгорнутая крытыка паможа сілы і ўзмацніць кіраўніцтва профсаюзаў. Пры адсутнасці крытыкі моцны работнік нярэдка злагаецца, аслабляе сваю пільнасць і ператвараецца ў бюракрата, які дзейнічае на руку ворагу. Разгорнутая самакрытыка руйнуе папяровае кіраўніцтва, вяртае маладзіну затоптаных кіраўнікоў, а затое ўзбройвае партыйных і непартыйных большэвікоў, натхняючы іх на ўдвое работу, ператвараючы іх у адданых кіраўнікоў. Прыклад такой самаўдзенай крытыкі даў пленум ВЦСПС. Не ліквідаўшы нічыёго самалюбства і самаўпэўненасці кіраўніцтва, пленум ВЦСПС сёння паказаў, што нашы людзі не такія нявычарпальны, што выраслі новыя кадры, якія могуць паспяхова пайсці на чыстку рады профсаюзнага актыва.

Краіна ідзе да новых выбараў совецкіх Сталінскай Канстытуцыі. Велізарны рост палітычнай актыўнасці мас з'яўляецца лучшай ілюстрацыяй нашай сілы, паказальнікам таго, што працоўныя нашай вялікай радзімы рэалізуюць цяпер апошнюю меры тых палітычных свабодаў, якія яны заваявалі за 20 год сацыялістычнай рэвалюцыі. Звязаны з ажыццяўленнем новай Канстытуцыі паварот у палітычным жыцці краіны адлюстроўвае, што за ўсё, велізарны рост палітычнай свядомасці мас. Культурна ўзрослыя, політычна паспеўшыя члены профсаюзаў хочуць патрабуюць ад сваіх кіраўнікоў, каб яны пакінулі працаваць па-старому, каб яны перабудаваліся не на словах, а на справе.

Рыхтуючыся да новых выбараў у совецкі, мы, большэвікі, не хочам атрымаць ні аднаго выбарчага бюлетэня ўканчным шляхам. Мы і не адчуваем патрэбы ў гэтым. Калі буржуазныя партыі перад выбарамі прымяняюць розныя ўлоўкі, каб ашукаць масы, каб хаваць карэнныя супярэчнасці і заляпіць язвы капіталістычнага ладу, то наша большэвіцкая падрыхтоўка да выбараў заключае ў сабе бязлітасную крытыку недахопаў і іх рэальнае знішчэнне. Бліжаючыся да новых выбараў па Сталінскай Канстытуцыі, мы павінны перш за ўсё навесці большэвіцкі парадак не толькі ў нашым партыйным доме, але і ў профсаюзных арганізацыях, тысячамі сцежак звязваючых партыю з рабочым класам.

Профсаюзы — бліжэйшая да партыі масавая арганізацыя. Яны аднаюць у сваіх радах каля 22 мільёнаў чалавек і набліжаюцца да таго, каб стаць пагалоўнай арганізацыяй рабочага класа. Яны злучаюць авангард з масай, звязваюць перадавых з адсталымі, выдзяляюць з свайго асяроддзя лепшых людзей для кіруючай работы ва ўсіх галінах кіраўніцтва. Яны — школа комунізма. Першаступенная задачай профсаюзаў з'яўляюцца клопаты аб палітычным выхаванні рабочых і служачых, клопаты аб задавальненні бытавых патрэб і культурных запатрабаванняў мас. Ажыццяўленне гэтых задач — ганаровы абавязак кожнага большэвіка. Необходна таму з усёй рашучасцю пакончыць з пагарджлівымі адносінамі да профработы. Необходна настойліва і любоўна выхоўваць і вырошчваць кадры профработнікаў, папаўняючы іх лепшымі, найбольш актыўнымі людзьмі, адданымі справе рабочага класа.

Па рашэнню пленума ВЦСПС закрытае галасаванне ўводзіцца адгэтуль за ўсіх прафесіянальных арганізацыях—знізу даверху: усе кіруючыя профработнікі, пачынаючы ад членаў фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў, а таксама арганізатараў профсаюзных груп і канчаючы кіраўнікамі абласных, краявых, рэспубліканскіх і цэнтральных камітэтаў профсаюзаў, будуць надалей выбірацца тайным галасаваннем. Кожная кандыдатура будзе пры гэтым прадметам падрабязнага абмеркавання. Неабмежаванае права адводу кандыдатур, забарона галасавання спісам, забарона падымаць агульныя сходы і праводзіць выбары на заводскіх канферэнцыях і канферэнцыях устаноў, увядзенне абавязковай справаздачнасці кожнага профсаюзнага органа перад масай выбаршчыкаў — усё гэта характарызуе паслядоўнасць на канца даведзенага дэмакратызма надыходячых выбараў.

Пары Сітрыны, злоўленыя в палічным і выкрытыя, як саўдзельнікі шпіёнска-правакатарскай арганізацыі прадпрымальнікаў, расхвальваюць на ўсіх перакрываючых дэмакратызм профарганізацыяй, якія далучаюцца да Амстэрдамскага інтэрнацыянала. Аднак, яны ніколі не рызыкавалі запытаць сапраўдную думку рабочых аб цяперашнім кіраўніцтве тройнёнаў, ды і зараз яны не прабуюць паставіць свае кандыдатуры на тайнае галасаванне. Паслядоўна развіваючы ўнутрысаюзную дэмакратыю і шчыра жадаючы хутчэй пакончыць з недахопамі сваёй работы, нашы профсаюзы зварачаюцца перш за ўсё да сапраўднага голасу мас.

Зусім ясна, што ад нашых сапраўдных дэмакратычных выбараў сему-таму не паздаровіцца. Закрытае (тайнае) галасаванне прыдзецца не па нутру ўсякім ворагам большэвізма, якія ўпарта чапляюцца за астаткі трэд-юніянізма, які насаджаўся Томскім. Новыя выбары не сулянь нічога добрага трацкістскім і бухарынскім шкоднікам, якія адсіджваюцца ў тых або іншых профсаюзных шчылінах, недастаткова праветрываемых свежым ветрам самакрытыкі.

Новыя выбары накіраваны супроць усякай палітычнай гнілі і нечысці. Палітычная пасіўнасць, бюракратычныя скажэнні, дзяляцтва будуць прадметам лютай крытыкі мас, а носьбіты гэтых скажэнняў вымушаны будуць або рашуча перабудаваць сваю работу, або ўступіць сваё месца новым людзям, здольным дзейнічаць па-большэвіцку.

Выбары нізавых прафесіянальных арганізацый — першы крок падрыхтоўкі да X Усесаюзнага з'езда прафесіянальных саюзаў. Гэты з'езд будзе гістарычным этапам совецкага профруху. Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб дапамагчы профсаюзам да канца зжыць перажываемы імі своеасаблівы крызіс і падняць іх работу на ўзровень Сталінскай эпохі.

„Правда“.

ХУТЧЭЙ ЗАВЯРШЫЦЬ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ!

НІВОДНАГА ГЕКТАРА ЯРАВОГА КЛІНА НЕ ПАВІННА АСТАЦЦА НЕЗАСЕЯНЫМ!

Па-ранейшаму соўгасы ў прарыве

Соўгасамі сістэмы Наркомсоўгасаў нашай рэспублікі пасеяна на 15 мая 89,3 проц. усіх яравых. Прайшоўшая пяцідзёнка па раду раней адстаючых соўгасаў не дала неабходнага пералому ў тэмпах сяўбы. Як і раней, гэтыя соўгасы, хаваючыся за сярэднімі лічбамі, астаюцца незаўважанымі наркаматам.

Характэрна, што большасць з адстаючых соўгасаў пачалі сяўбу значна раней тых соўгасаў, якія ўжо поўнасцю скончылі пасеўную. Соўгас «Добрынь», Ельскага раёна (дырэктар т. Ярн), адным з першых уступіў у сяўбу, але на 15 мая пасеяў толькі 63 проц. У гэтым соўгасе яшчэ далёка не скончана пасадка бульбы, пасеў аднагадовых траў і іншых культур.

Не лепш справа абстаіць і ў соўгасе імя Калініна, Менскага раёна (дырэктар т. Давідовіч). Соўгас яшчэ на сёння не скончыў сяўбы зернавых культур, не гаворачы ўжо аб прамышленных (бульба, карняплоды). Гэты соўгас, таксама, як і «Добрынь», уступіў у сяўбу адным з першых. Дырэктары гэтых соўгасаў тт. Ярн і Давідовіч, як відаць, лічаць, што спяшыць няма чаго. Яны не зрабілі для сябе ніякіх вываў з апошняй пастановы ЦК КП(б)Б і Соўнаркома БССР аб ходзе сяўбы па рэспубліцы.

Такую-ж лінію занялі і дырэктары соўгасаў—«Капацэвічы», Старобінскага раёна, т. Сушко і «Петроліна», Плешчаніцкага раёна, т. Асмалоўскі. Соўгас «Капацэвічы» пасеяў 58 проц. плана. Тут яшчэ не скончылі сяўбы зернавых і бабовых. Соўгас «Петроліна» пры выкананні плана сяўбы на 60 проц. пачаў адставаць па пасадцы бульбы—з 62 гектараў пасаджана толькі 26 гектараў. Апраўдання гэнебнага адставання з сяўбой кіраўніцтва гэтых соўгасаў ніякіх не мае.

Па-ранейшаму знаходзіцца ў прарыве соўгас «Лагоза», Лагойскага раёна (дырэктар т. Еленевіч.) План сяўбы гэтым соўгасам выканан на 50 проц.

Вельмі марудна праходзіць у соўгасах сяўба прамышленных культур. План сяўбы па гэтых культурах выканан толькі на 81 проц. Маючы значны план пасеву бульбы, такія соўгасы, як «Натальеўск», «Вялікія Навасёлкі», імя Сталіна за апошнюю пяцідзёнку не пасеялі ні аднаго гектара. Соўгасам: «Чырвоны Кастрычнік», «Перадавы», «Магучы», «Негарэлае», «Свабода» асталося сеяць больш паловы плана. Тэмпы пасадкі бульбы ніяк не забяспечваюць хуткага завяршэння сяўбы.

Не лепш абстаіць справа і з пасадкай карняплодаў. З 1524 гектараў карняплодаў пасаджана толькі 550 га або 36 проц. плана. Такія соўгасы, як «Чырвоны маяк», «Старая Веліца», «Чырвоны сцяг», «Нача-Шпакоўшчына» і іншыя не пасадзілі ні аднаго гектара карняплодаў.

Апошняя пяцідзёнка гаворыць аб самасушакоеласці кіраўнікоў асобных соўгасаў у хутчэйшым завяршэнні палявых работ. А сяўбу неабходна было скончыць значна раней. Патрэбна прыняць усе меры, каб неадкладна завяршыць сяўбу і пераключыцца на праполку азімых і яравых.

М. КАГАН.

Няма клопатаў аб ураджаі

Веснавая сяўба ў калгасах Любаньскага раёна праходзіць вельмі марудна. Кіраўніцтва пасеўнай кампаніяй перадаверана райземаддзелу. Райком партыі і райвыканком астаецца ў ролі наглядальніка. У радзе калгасаў пасеяна не больш 50 проц. плана яравых.

У калгасе «Другая пяцігодка», Слабодскага сельсавета, план сяўбы яравых выканан толькі на 50 проц. У калгасе «Комсамолец», гэтага-ж сельсавета, пасаджана 50 гектараў бульбы, а трэба 85 гектараў. Агратэхніка парушаецца. Пасля рутной сяўбы зернавых не баранавалі, а пружынавалі. Авёс, пратручаны 5 мая, пасеялі толькі 11 мая.

Галоўная прычына адставання гэтага калгаса ў тым, што тут парушаецца сталінскі статут сельскагаспадарчай арцелі. Старшыня калгаса Тамсон без ніякай згоды агульнага схода калгаснікаў раздаў лапар розным арганізацыям м. Любань.

Усе гэтыя агідныя дзеянні творацца літаральна на вачах раённых арганізацый. Калгас «Комсамолец» знаходзіцца ў трох кілометрах ад рэйшнага цэнтра. Аднак, нічога не зроблена для таго, каб дапамагчы калгасу.

Не лепшае становішча з сяўбой і ў радзе іншых калгасаў. Напрыклад, калгасы Юшкаўскага сельсавета пасеялі 1252 гектары, пры плане 2189. За пяцідзёнку ў калгасах пасеялі толькі 4 гектары пшаніцы.

У калгасе імя Фрунзе, гэтага-ж сельсавета, замест 60 гектараў па плану, пасеяна 47 гектараў. Калгас павінен пасеяць 25 гектараў ільну, між тым сяўба яго толькі што распачата. Самацёкам праходзіць сяўба і ў калгасе «Чырвоны заляроб».

Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, як відаць, нікольскі не трывожацца за лёс будучага ўраджаю. Тут па-ранейшаму цішыня і спакой, няма канкрэтнага аператыўнага кіраўніцтва калгасамі, сяўбой, адсутнічае практычная дапамога стахановцам.

СКУЦЭНЯ.

Спаборніцтва за высокі ўраджай

Перадавы калгас імя Калініна, Лёзнянскага раёна, старшынёю якога з'яўляецца ініцыятар стаханаўскага руху па ільну ордэнаносец Сцепаніда Быкоўская, адным з першых скончыў сяўбу ільну.

Сяўба праведзена на лепшых, утоенных папярэдніках. Усе калгаснікі выбіралі пад лён лепшую зямлю. Насенне — ўсё селекцыйнае — мела высокую ўсхожасць і чыстату. Пад пасевы ўнесці попел, птушыны памёт і розныя мінеральныя ўгнаенні.

Старшыня калгаса Сцепаніда Быкоўская і інспектар па якасці Фама Швайчанка ўвесь час былі на полі, правяралі якасць і тут-жа прымалі засеяныя ўчасткі.

Звенні штодзённа спаборнічалі паміж сабою на хутчэйшае і высакаякаснае правядзенне сяўбы ільну. У выніку соцыялістычнага спаборніцтва ўся плошча ільну ў 68 гектараў засеяна на працягу 6 дзён. Ні адно звяно не адстала ў рабоце.

Першы тур барацьбы за ўраджай ільну паказаў, што калгаснікі свае абавязацельствы выконваюць па-большэвіцку. Але на гэтым у калгасе не супакойваюцца. Яшчэ з большым запалам калгаснікі ўступаюць у другі тур — праполку і догляд пасеваў.

А. ЛОСЬ.

Зацягнулі пасадку бульбы

Марудна садзяць бульбу ў калгасах Жлобінскага раёна. У большасці калгасаў да гэтага часу ўсё яшчэ «распачынаюцца».

Так у калгасе імя Энгельса, Кароткаўскага сельсавета, пасаджана ўсяго 15 гектараў бульбы. Патрэбна-ж пасадзіць 40 гектараў.

Чаму адстае калгас?

Уся прычына крыецца ў адсутнічанні прапоўнай дысцыпліны і правільнай арганізацыі працы. Калгаснікі на работу выходзяць позна, у 11—12 гадзін дня, працуюць скопам. Не арганізавала сацыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі, звенямі. Старшыня калгаса Карнеенка і брыгадзіры адседжваюцца ў канцылярыі, не цікавяцца работай на полі.

Падобнае з'явішча і ў калгасе «17-годдзе Кастрычніка». Тут пасаджана больш 10 гектараў бульбы. Па распараджэнню старшыні калгаса Ісаенкі ў апошнія дні пасадку бульбы ўсім спынілі. Усе калгаснікі спяшаюцца засеяць свае прысядзібныя ўчасткі, пакідаючы работу на калгасным полі.

Трэба адзначыць, што і кіраўнікі Кароткаўскага сельсавета (старшыня Рабянок) займаюць пасіўны наглядальнікаў, пра пасадку бульбы забылі.

Такое-ж становішча і ў калгасе «Не варце». Салонскага сельсавета. У брыгадзе Кучарава Трафіма не пасаджана 8 гектараў бульбы.

— Нашы дзяды заўсёды садзілі бульбу, калі адцвітуць сады, — разважае Кучараў.

Яшчэ горш абстаіць справа ў калгасе імя 17 партз'езда. Мала таго, што пасадка бульбы зацягваецца, дык тут парушаюць правілы агратэхнікі, садзяць яе ўадпавор і па ямгучнасцей гнезбе.

В. ШЫБІНСКІ.

ПУСТУЕ ЗЯМЛЯ

На сядзібе Рудзенскай МТС ёсць 40 гектараў ворыўнай зямлі. Ужо другі год, як гэты ўчастак пустуе, астаецца незасеяным.

Сёлета тной вывезен толькі на 0,15 гектара. Пасеяна-ж пакуль толькі 4 гектары аўса і 0,32 гектара гародніны. На 20 гектараў зямлі ў МТС не хапае насення.

Загадчык гаспаларкі Пярэшчынка, а таксама дырэктар МТС нічога не зрабілі, каб засеяць усю плошчу зямлі. Наадварот, яны зрываюць сяўбу.

РАБОЧЫ.

ГУТАРКІ ТАВ. ЛІТВІНАВА З БЛЮМАМ І ДЭЛЬБОСАМ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 18 мая. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас, міністэрства замежных спраў апублікавала наступнае паведамленне:

«Паміж прэм'ерам Блюмам і міністрам замежных спраў Дэльбосам, з аднаго боку, і Літвінавым—з другога, адбыўся шырокі і сардэчны абмен думак, у часе якога была канстатавана наяўнасць прызнаных адносін паміж абодвума краінамі і агульнасць мэтаў палітыкі Францыі і СССР, накіраванай на захаванне непадзельнага міру ў рамках калектыўнай безапаснасці.

Абодва бакі пацвердзілі сваю вернасць дагавору, які звязвае абедзьве краіны, і рашучасць прадаўжаць у рамках Лігі нацый і ў адпаведнасці з яе прынцыпамі лайяльную палітыку міжнароднага супрацоўніцтва».

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 19 мая. (БЕЛТА). Увесь друк угледжвае ў гутарках Літвінава з Блюмам і Дэльбосам (прэм'ерам і міністрам замежных спраў Францыі) новае праяўленне франка-совецкай дружбы, якая мае вялікае значэнне не толькі для двух непасрэдна зацікаўленых краін, але і для справы міру ў Еўропе.

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 20 мая. (БЕЛТА). Газета «Кур'ер варшаўскі», каментуючы перагаворы тав. Літвінава з Блюмам і Дэльбосам, заяўляе, што надзеі Берліна і Рыма на аслабленне франка-совецкіх адносін у рэзультаце гэтых перагавораў адпадаюць. Адначасова адпадае ілюзія адносна рэформы Лігі нацый.

***

БЕРЛІН (сталіца Германіі). 19 мая. (БЕЛТА). Германскі друк пільна сочыць за дыпламатычнымі перагаворамі ў Парыжы. Фашысцкія газеты з нездавальненнем падкрэсліваюць, што «вялікі дыпламатычны тыдзень у Парыжы адкрыў кіраўнік совецкай дыпламатыі Літвінаў сваімі гутаркамі з Блюмам і Дэльбосам».

Рад берлінскіх газет «рэагуе» на паведамленне аб гутарцы тав. Літвінава з Дэльбосам звычайнымі нападкамі на франка-совецкі пакт аб узаемнай дапамозе.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 мая. (БЕЛТА). Учора галава французскага ўрада Леон Блюм наведаў у памяшканні паўпрэдства СССР народнага камісара замежных спраў СССР тав. М. М. Літвінава і меў з ім доўгую гутарку.

ХОД СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ПА СССР

Згодна чарговай зводкі Наркамзема, Наркамсоўгасаў і Наркамхарчпрома СССР аб ходзе веснавой сяўбы, на 15 мая па СССР засеяна 72.797 тысяч гектараў — 78 проц. плана.

На 10 мая было засеяна 64.884 тысячы гектараў — 69 проц. Такім чынам прырост за пяцідзёнку складае 9 проц.

На 15 мая 1936 г. было засеяна 73,002 тысячы гектараў — 79 проц. плана.

Па Беларускай ССР, згодна агульнасаюзнай зводкі, засеяна 1.889 тысяч гектараў — 78 проц. задання. Калгасамі засеяна 1.721 тысяча, аднаасобнымі гаспадаркамі — 82 тысячы, соўгасамі — 86 тысяч гектараў.

Закончылі сяўбу яравых Кабардзіна-Балкарская АССР і Калінінская вобласць. Набліжаюцца да завяршэння сяўбы Азова-Чорнаморскі, Орджанікідзеўскі краі і Сталінградская вобласць. Паслабіла тэмпы Украінская ССР, дзе на 15 мая засеяна 86 проц. плана.

НАХАБНАЯ ВЫХАДКА ЯПОНСКІХ ШПІЁНАЎ

ХАБАРАЎСК, 20 мая. (БЕЛТА). Тут атрымана паведамленне аб тым, што 14 мая нарадам пагранаховы СССР, рабіўшым абход граніцы ў раёне Славянкі, быў выяўлен за 2½ кілометры ад лініі граніцы на тэрыторыі СССР замаскіраваны палявы тэлефонны кабель, пракладзены ад лініі граніцы. Ідучы ўдоўж па кабелю, нарад у хуткім часе натнаў двух невядомых асоб, якія, заўважыўшы пагранічнікаў, адкрылі па іх стральбу. У рэзультаце завязаўшайся перастрэлкі адзін з парушальнікаў быў забіт, другі-ж паспеў скрыцца ў напрамку манчжурскай тэрыторыі.

У рэзультаце праведзенага абследвання мясцовасці было ўстаноўлена, што выяўлены пагранаховай тэлефонны кабель быў праложан ад лініі граніцы ўглыб тэрыторыі СССР з яўнай мэтай уключэння ў совецкую пагранічную тэлефонную лінію. На месцы інцыдэнта падабрана 6 маткоў палявога кабеля, кусачкі і іншыя рэчы.

НА ПЛЕНУМЕ МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

19 мая ў клубе імя Сталіна адбыўся пленум менскага гарадскога совета, прысвечаны зацвярджэнню генеральнага плана рэканструкцыі Менска. Дакладчыкі—старшыня горсовета т. Жуковіч і аўтар праекта архітэктар т. Кілаватаў—падрабязна расказалі аб этапах распрацоўкі плана і аб сённішнім варыянце. Перад кожным паўстаў вобраз будучага Менска — вялікага, прамысловага, здаровага і культурнага сацыялістычнага горада.

У абмеркаванні генеральнага плана прынялі ўдзел тт. Каплан (тэхнічны кіраўнік асфальтавага завода), Магілеўчык (акадэмія навук), Якушка (гарадскі архітэктар), Шэршнёў (служба шляху Заходняй чыгункі), Брэгман (начальнік архітэктурна-планіровачнага кіраўніцтва горсовета), Пучкін (трэст зялёнага будаўніцтва) і інш. У асноўным усе яны ўхвалілі прадасланы на зацверджанне генеральны план рэканструкцыі, а таксама ўносілі свае папраўкі. У прыватнасці, многа палемікі было ў адносінах размяшчэння ГЭС, размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў, афармлення плошчаў і т. д. Усе выступаўшыя правільна крытыкавалі гарадскі совет за яго мяккацеласць у адносінах тых, якія ўжо зараз парушаюць генеральны план рэканструкцыі (дом КІЖ'а на вуліцы імя Кірава, школа на рагу вуліц Карла Маркса і Свярдлоўскай і інш. аб'екты пабудаваны без усякага ўліку намечанай планіроўкі). Крытыкавалі і за тое, што генеральны план рэканструкцыі сталіцы БССР зусім недастаткова абмеркаваны у працоўных масах.

Па прапанове тт. Эпштэйна (ГК КП(б)Б і Дзядковай (Сталінскі РК КП(б)Б) пленум не згадзіўся з прапановай тав. Жуковіча — зацвердзіць генеральны план рэканструкцыі Менска на гэтым-жа пленуме. Вырашана прадстаўлены план ухваліць, праект пастановы надрукаваць і разаслаць для азнаямлення ўсім дэпутатам гарадскога совета. Канчатковае зацвярджанне генеральнага плана рэканструкцыі Менска перанесена на наступны пленум.

***

Пленум горсовета на сваім пасяджэнні 19 мая вывеў са складу членаў пленума горсовета Бенека К. Ф. і Дзякава А. І.

Н. ГАРНЫ.

Міралюбівыя заявы японскага міністра замежных спраў Сато

ТОКІО (сталіца Японіі), 19 мая. (БЕЛТА). 17 мая на канферэнцыі губернатараў з прамовай выступіў міністр замежных спраў Сато. У якасці важнейшай задачы Японіі ў галіне яе замежнай палітыкі Сато высунуў «дзейнасць па ўрэгуляванню адносін Японіі з Кітаем, а таксама з СССР».

Згодна афіцыяльнага паведамлення, апублікаванага міністэрствам замежных спраў, Сато пачаў прамову з заявы аб тым, што «дзяржаўнай палітыкай Японіі з'яўляецца ўстанаўленне стабілізацыі ва ўсходняй Азіі» і што «абстаноўка ва ўсім свеце ў сучасны момант па-ранейшаму з'яўляецца неўрэгуляванай».

Перайшоўшы да пытання аб адносінах Японіі з Совецкім Саюзам, Сато заявіў:

«СССР прысвяціў нядаўна свае намаганні развіццю лёгкай прамысловасці ў адпаведнасці з так званай другой пяцігоддзай. З 1938 года ў адпаведнасці з трэцяй пяцігоддзай ён сканцэнтруе сваю ўвагу на забеспячэнні далейшага росту прамысловасці і культурнага прагрэсу насельніцтва. Совецкі ўрад імкнецца да павелічэння сваіх узбраенняў і павялічэння эканамічнай магутнасці краіны. У далёкаўсходніх уладаннях СССР, якія маюць найважнейшыя адносіны да Японіі, з найвялікшай энергіяй і хуткасцю прасоўваецца наперад работа па ўзвядзенню ваенных умацаванняў і развіццю ваеннай прамысловасці».

Сато заляўніў, што «японскі ўрад прабуе знішчыць усе непатрэбныя сутычкі паміж двума гэтымі краінамі і ў той-жа час урэгуляваць нявырашаныя пытанні, як пытанні аб рыбалоўстве, аб паўночнасахалінскіх канцэсіях і аб совецка-манчжурскіх пагранічных камісіях». Пры гэтым Сато адзначыў наяўнасць непатрэбных сутычак паміж абодвума бакамі на глебе абыходжання мясцовых улад з грамадзянамі і суднамі другога боку. Паведаміўшы, што ён прасіў совецкі ўрад аб прыняцці адпаведных мер, Сато заклікаў губернатараў да праяўлення асцярожнасці ў адносінах совецкіх грамадзян і суднаў.

АДКРЫЛАСЯ НАРАДА АКТЫВА РАБОТНІКАЎ РАДЫЁВЯЩЧАННЯ

Учора ў памяшканні Вышэйшай сельскагаспадарчай комуністычнай школы адкрылася нарада актыва работнікаў радыёвяшчання, скліканая Радыёкамітэтам пры СНК БССР і прысвечаная абмеркаванню рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і задач радыёвяшчання. У нарадзе прымаюць удзел запрошаныя з раёнаў работнікі нізавога радыёвяшчання.

З дакладам аб рашэннях Пленума ЦК ВКП(б) і задачах радыёвяшчання выступіў старшыня радыёкамітэта пры СНК БССР тав. Гарачэў. Чатырохгадзінны даклад усё-ж не ўскрыў з усёй глыбінёй прычын шматлікіх зрываў і недахопаў, рэцэдываў дзейнасці ворагаў народу ў радыёвяшчанні і той сістэмы блытаніны і безадказнасці, якая характэрна для работы Радыёкамітэта і яго кіраўніцтва нізавым радыёвяшчаннем.

Спрэчкі, якія разгортваюцца сёння, павінны папоўніць гэты прабел даклада, бязлітасна ўскрыць недахопы ў рабоце радыёвяшчання і іх канкрэтных вінаўнікаў.

Т. ХАТКЕВІЧ.

Пленум Менскага гаркома КП(б)Б

— 23 мая ў 11 гадзін раніцы ў памяшканні Менгаркома КП(б)Б скліканы ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б. НА ПАРАДКУ ДНЯ: ПЫТАННІ ГАРАДСКОЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ.

АБ ДВАЦЦАЦІПЯЦІГОДДЗІ „ПРАВДЫ“ І ЗАДАЧАХ ДРУКУ

(З даклада тав. Б. М. Таля на агульнамаскоўскім сходзе работнікаў друку і рабселькораў)

„Правда“—верны хавальнік традыцый большэвізма

Дзень дваццаціпяцігоддзя «Правды» — знамянальная дата ў гісторыі большэвіцкай партыі. Гісторыя «Правды» неразрыўна звязана з гісторыяй вялікай партыі Леніна—Сталіна.

«Правда» ўзнікла ў 1912 годзе паводле рашэння Пражскай канферэнцыі. Яна радзілася на хвалі рэволюцыйнага ўздыму і на ўсім працягу прайшоўшага дваццаціпяцігоддзя заўсёды з'яўлялася магутнай і астрэйшай зброяй у руках большэвіцкай партыі ў барацьбе за згуртаванне сіл большэвізма і рабочага класа, за перамогу дыктатуры пролетарыята і трыумф соцыялізма.

Большэвіцкая «Правда» 25 год высока нясе сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. Большэвіцкая «Правда» на працягу чверці стагоддзя няўхільна і непрымірыма змагаецца з усімі ворагамі партыі і рабочага класа, бязлітасна выкрывае іх, якое-б аблічча яны ні прымалі. «Правда» з моманту свайго ўзнікнення непрымірыма змагалася з ліквідатарамі, трацкістамі, адзавістамі, з усімі агентамі буржуазіі, разлагаўшымі рабочы рух; у 1917 годзе на подступах да Кастрычніка і пазней яна нястомна і бязлітасна граміла ўсіх, хто здраджваў вялікай справе пролетарскай рэволюцыі, хто перашкаджаў барацьбе за дыктатуру пролетарыята, за соцыялізм. Яна граміла Троцкага і Радэка, Каменева і Зіноўева, Бухарына і Рыкава і ўсіх, хто з імі, — усіх ворагаў соцыялізма, усіх, хто станавіўся на шляху пераможнага руху пролетарскай рэволюцыі наперад.

Ля калыбелі «Правды» стаялі вялікія правадыры і стваральнікі большэвіцкай партыі — Ленін і Сталін. Яны з'явіліся яе аснавальнікамі і натхніцелямі. На старонках «Правды» таго часу можна знайсці многія дзесяткі артыкулаў Леніна і Сталіна. Цэлы рад пісем, указанняў і дырэктыў Леніна і Сталіна паказваюць, якія выключныя клопаты аб «Правде» праяўлялі правадыры нашай партыі. З «Правдой» звязаны імёны тт. Молатава, Калініна і раду іншых выдатных кіраўнікоў большэвіцкай партыі.

У дзень дваццаціпяцігоддзя «Правды» мы, работнікі друку, горача вітаем калектыў работнікаў «Правды» і ўсю многатысячную армію большэвікоў, партыйных і непартыйных, якія робяць «Правду». «Правда» — сапраўдная большэвіцкая газета, тысячамі ніцей звязаная з найшырэйшымі масамі.

Для нас усякая рэволюцыйная гадавіна з'яўляецца повадам для таго, каб узімаць урокі мінулага і, знішчаючы недахопы, ісці наперад, да новых перамог.

Усім работнікам друку трэба поўнасцю ўсвоіць і ў новых умовах правесці ў жыццё слаўныя большэвіцкія традыцыі «Правды».

Гэтыя традыцыі перш за ўсё заключаюць у тым, што большэвіцкая «Правда» заўсёды высока несла сцяг большэвіцкай партыйнасці, сцяг ленінска-сталінскай непрымірымасці да ворагаў партыі. Большэвіцкая традыцыя «Правды» заключаецца ў цяснейшай сувязі яе з Цэнтральным Камітэтам ленінска-сталінскай партыі. Традыцыя «Правды» — у вострай і непрымірымай барацьбе з усімі ворагамі партыі. Вострая большэвіцкая пільнасць, умейнае выкрываць і бязлітасна біць ворагаў — вось што перш за ўсё патрабуецца ад кожнай нашай газеты.

Другой большэвіцкай традыцыяй «Правды» з'яўляецца яе высокі ідэйны ўзровень, марксісцка-ленінская прынцыповасць. На працягу сваёй гісторыі «Правда» давала бліскучыя ўзоры глыбокага марксісцка-ленінскага аналізу, які дапамагаў разбірацца ў канкрэтнай абстаноўцы, высоўваць і абгрунтоўваць тыя лозунгі барацьбы, якія з гэтай абстаноўкі выцякалі.

Вось, напрыклад, артыкул Леніна, змешчаны ў «Правдзе» 21 жніўня 1912 г. Ён называецца: «Заработкі рабочых і прыбытак капіталістаў у Расіі». Ленін у маленькім артыкуле, аперуючы, здавалася-б, сухімі статыстычнымі данымі, з выключным майстэрствам наглядна паказвае, у чым заключалася эксплаатацыя рабочых, як рабочы на працягу 11-гадзіннага рабочага дня ўсяго каля 5,5 гадзін працаваў, пакрываючы сваю зарплату, а астатнія 5,5 гадзін працаваў на прыбытак капіталіста. Што можа быць яркай і наглядней для выхавання самых шырокіх рабочых мас у духу класавай барацьбы, непрымірымай барацьбы з буржуазіяй, чым гэты глыбокі эканамічны аналіз, пабудаваны на канкрэтных прыкладах? Ленінскі артыкул з'яўляецца бліскучай старонкай марксісцкай палітычнай эканоміі і, разам з тым, дае нагляднейшыя вывады і лозунгі, якія завуць рабочы клас на шлях непрымірымай барацьбы з буржуазіяй.

Такі-ж і артыкул Сталіна «Воля ўпаўнаважаных» у «Правде» ад 1 лістапада 1912 года, калі партыя правяла ўпартую барацьбу ў сувязі з выбарамі ў 4-ю дзяржаўную Думу, імкнучыся ў найтрудней шых умовах правесці сваіх кандыдатаў — большэвікоў. У гэтым артыкуле, напісаным па абсалютна канкрэтнаму поваду — па пытанню аб тым, за якіх кандыдатаў павінны галасаваць рабочыя,— таварыш Сталін ярка разгарнуў шырокую праграму большэвіцкай барацьбы, сфармуляваўшы задачы, пастаўленыя рэволюцыяй 1905 года, — пытанне аб гегемоніі пролетарыята, саюзе з сялянствам, чоткa абгрунтаваў найгрозаныя лозунгі большэвікоў.

У невялікім артыкуле таварыш Сталін разгарнуў рэвал практычных пытанняў выбараў у Думу асноўныя задачы рэволюцыйнай барацьбы.

Гэтыя прыклады даволі красамоўны. Высокі ідэйны ўзровень, які неразрыўна спалучаецца з палітычнай астрэтой, — важнейшая традыцыя большэвіцкай «Правды».

Яркай і выдатнай традыцыяй большэвіцкай «Правды» з'яўляецца яе неразрыўная сувязь з масамі. Большэвіцкая «Правда» ніколі не была і не магла быць газетай кабінетнай. «Правда» была створана на рабочыя капейкі. Нельга без хвалявання чытаць дакументы аб зборы сродкаў на «Правду» ў рабочых групах. Ленін надаваў выключнае значэнне гэтым рабочым групам. Па іх росту ён вызначаў уплыў партыі і «Правды» ў масах. У «Правде» зарадзіўся выдатны рабкораўскі рух, «Правда» вяла штодзённую работу з рабочымі — карэспандэнтамі, праяўляла найвялікшыя клопаты аб іх пісьмах.

З пункту гледжання гэтых большэвіцкіх традыцый «Правды» трэба падыйсці да ацэнкі работы і чарговых задач нашага друку.

Аб газетных кадрах

Каб газеты справіліся з новымі задачамі, павінны быць зменены адносіны да падбору газетных кадраў і партыйнага кіраўніцтва друкам на мясцах.

Газетныя кадры ў цэлым не адпавядаюць прад'яўляемым да іх патрабаванням. У сілу таго, што многія партарганізацыі адышлі ад большэвіцкіх традыцый у галіне кіраўніцтва друкам і перадаверылі гэту справу другарадным работнікам, газетныя кадры аказаліся малакваліфікаванымі. Многія газетныя работнікі былі перакінуты на іншую, не газетную, работу, а з газетнымі кадрамі не вялася неабходная работа па іх палітычнаму выхаванню і абучэнню. Між тым, узброіць газетных работнікаў большэвізмам, сур'ёзна ўмацаваць газетныя кадры — галоўная ўмова паспяховага вырашэння задач, якія стаяць перад нашым друкам.

З другога боку, за апошнія гады газеты амаль не праводзілі сістэматычнага сур'ёзнага падбору новых кваліфікаваных кадраў. Не ўсякі-ж можа стаць журналістам шляхам абучэння ў якой-небудзь навучальнай установе, калі ён не мае прызвання да гэтай справы. Трэба ўважліва падбіраць тую моладзь, тыя кадры, якія любяць друк, якія маюць прызванне да гэтай складанай і патрабуючай рознабокіх якасцей справы. У газеты неабходна смялей вылучаць падрыхтаваных і здольных рабселькораў, а ў нас з гэтым вылучэннем справа абстаіць надзвычай слаба. Трэба адбіраць у газеты маючых прызванне і даныя для работы ў друку канчаючых вышэйшыя навучальныя ўстановы. Хіба з іх нельга вербаваць газетныя кадры, папаўняючы рэдакцыі новымі, культурнымі сіламі?

Нарэшце, трэба правесці велізарную работу па перападрыхтоўцы нашых кадраў рэдактараў. Перападрыхтоўку рэдактараў трэба паставіць такім чынам, як ставіцца гэта справа зараз у адносінах кіруючых партыйных кадраў.

Трэба нашы газетныя кадры ўзброіць палітычна, узброіць іх большэвізмам.

Нізавому друку—асаблівая ўвага і дапамога

З асаблівай вострасцю стаіць гэта пытанне ў адносінах нашага нізавога друку. Нізавы друк адыгрывае велізарнейшую ролю. Гэтага многія не разумеюць і недаацэньваюць.

Раённых газет у нас ёсць звыш 3.200, разавы тыраж гэтых газет — 11 мільёнаў. Гэта вельмі вялікая сіла. Выбары ў Саветы па-новаму будуць праводзіцца па выбарчых акругах, якія складаюцца з 3—4 раёнаў. Велізарную ролю ў правільнай арганізацыі выбараў па новай Канстытуцыі будзе адыгрываць іменна раённы друк.

Між тым, раённы друк у многіх месцах проста марнее. Асігнуюцца грошы на бюджэту, але гэтыя грошы часта не даходзяць да раённых газет. Амаль кожны абласны выканком стараецца ўварваць у раённых газет іх грошы на іншыя патрэбы. Гэта абсалютна нецярпіма. Матэрыяльная база раённых газет патрабуе радыкальнага паляпшэння. Гэта адносіцца і да іх друкарняў, памяшканняў, да паперы, на якой друкуюцца раённыя газеты, і т. д.

Рашучага паляпшэння патрабуе партыйнае кіраўніцтва раённым друкам. Аб тым, як часам у нас «кіруюць» раённымі газетамі, сведчыць хоць-бы наступны красамоўны факт. У Орэнбургскай вобласці сакратар Іванаўскага райкома тав. Ундалаў аднойчы прачытаў у раённай газеце «Голос ударника» заметку, у якой гаварылася: «Асобныя кіраўнікі раёна безадказна адносяцца да хлебаздачы, прымаючы хлеб свіркамі». Увогуле, самая прымітыўная крытыка. Але ўдалы і заўзяты тав. Ундалаў угледзеў у гэтай заметцы выпад, накіраваны супроць кіраўнікоў раёна, супроць партыі. У рэзультаце — газета была Ундалавым канфіскавана і спалена. Чым не шчодрынскі герой!

Падобныя з'явы паказваюць, што ў многіх месцах партыйнае кіраўніцтва друкам спаўзло з большэвіцкіх традыцый у гэтай галіне.

Пленум ЦК ВКП(б) в усёй рэзкасцю падкрэсліў, што трэба вярнуцца да большэвіцкіх традыцый кіраўніцтва друкам адносін да газет і іх кадраў. Самакрытыка ў газетах павінна быць сапраўдная, па-большэвіцку вострай, наперакор самадурству Ундалавым.

Моцнае партыйнае кіраўніцтва друкам тым больш неабходна, што работа газет працякае ў абстаноўцы абвостранай класавай барацьбы з асколкамі разгромленых класавых ворагаў. Даволі напомніць пра стрэл, які нядаўна прагрымеў у Коркмасе Калінскім раёне, Дагестанскай рэспубліцы, дзе старшыня райвыканкома Багмадаў за біў рэдактара раённай газеты тав. Батырова, выкрыўшага буржуазна-нацыянал стычную контррэволюцыйную групу. Н спынілася праследаванне рабселькораў. Га та праследаванне мае рознастайныя формы.

Для заціску самакрытыкі ў газета прыстасоўваюць розныя метады. Вось, н прыклад, тав. Бубнаў на другі дзень па ля апублікавання ў газеце «За коммунист ческое просвещение» востра крытычнаг дзелавога артыкула аднаго школьнага р ботніка проста напісаў рэдактару газет «За коммунистическое просвещение»:

«Прапаную вам вынікаў за другу чверць («першаз паўгоддзе») 1936-3 навучальнага года ў газеце не апублікоў ваць. Калі ў вас будуць заметкі па гэты пытаннях па школах РСФСР, то спача ку пасылайце іх мне».

Ітак, газеце забараняецца друкаваць пт небудзь па выніках вучэбнага паўгодз без узгаднення з наркомам. А чым, уст пытанне, павінна займацца газета «Н коммунистическое просвещение», калі і вынікамі вучэбнага паўгодзя, нават ка гэтыя вынікі не асабліва прыгляды і ка самакрытычнае іх асвятленне засмучае н каторых наркомаў?

Самакрытыка ў друку тым больш па пяхова будзе разгортвацца, чым боль канкрэтна і правільна будзе ажыццяўляц ца партыйнае кіраўніцтва газетамі. Тое трэба сказаць і пра кіраўніцтва велізар най арміяй рабселькораў.

Да канца выкрыць ворагаў партыі і народу

Нельга сказаць, што наш друк у цэлым праводзіць у жыццё большэвіцкія традыцыі «Правды».

Возьмем адну з найслаўнейшых традыцый «Правды» — большэвіцкую партыйнасць, большэвіцкую пільнасць і непрымірымасць да ворагаў.

У гэтай галіне ў нашага друку ёсць вельмі многа недахопаў і сур'ёзных прарываў. Япона-гэрмана-трацкісцкія агенты і іх саратнікі — правыя рэстаўратары капіталізма, як вядома, здолелі пралезці ў некаторыя органы нашага друку. Найбольш наглядным прыкладам тут можа служыць газета «Известия». Трацкісцкія і правыя рэстаўратары капіталізма, фашысцкія агенты звілі сабе там моцнае гняздо. Там сядзелі Бухарын і Радэк — гэтыя злосныя ворагі народу — ворагі соцыялізма. Лоўка скарыстоўваючы палітычную слепату і бясклопатнасць некаторых неасабліва дальнавідных людзей у рэдакцыі, яны здолелі скарыстаць у сваіх гнусных мэтах апарат газеты. Работнікі «Известий», заражоныя ідэйнай хваробай бясклопатнасці, не змоглі самі выкрыць гняздо злобных ворагаў народу, якія ў іх над носам рабілі свае антысавецкія гнуснейшыя справы.

Павучальны прыклад краснадарскай газеты «Красное знамя». Гэта газета часта дапускала надаўзроўныя памылкі і «памылкі друку». Мясцовыя арганізацыі не надавалі ім асаблівага значэння. Нават калі азова-чорнаморскаму крайкому было даручана самому гэтай справай, ён у ёй да канца не разабраўся. Між тым, у рэдакцыі была раскрыта банда трацкістаў—контрэволюцыйных злачынцаў, якія прызналіся, што памылкі і «памылкі друку» ў газеце рабіліся імі наўмысла, у парадку антысавецкай работы.

Пільнасць для работнікаў друку — галоўнае патрабаванне. Трэба ведаць, што за людзі працуюць у газеце. Трэба ведаць не толькі рэдакцыйных работнікаў, але і ўсіх, хто мае адносіны да газеты. Хіба характар ці наборшчык, калі яны скрытыя ворагі, не могуць напакасціць у газеце?

Большэвіцкая партыйнасць, астрэйшая большэвіцкая пільнасць — гэта першае патрабаванне да кожнага работніка большэвіцкага друку, якое павінна зараз гучэць асабліва рашуча, цвёрда і няўхільна.

Вышэй ідэйны ўзровень газеты!

Другая большэвіцкая традыцыя «Правды» — яе высокі ідэйны ўзровень — таксама не ўспрынята нашымі газетамі.

Усім вядома, якое сусветнагістарычнае значэнне мае Сталінская Канстытуцыя. Прапаганда, правільнае растлумачэнне Канстытуцыі — важнейшы абавязак кожнай газеты.

Між тым, газеты не толькі не надалі патрэбнага размаху справе прапаганды Канстытуцыі, але нярэдка дапускалі ў артыкулах аб Канстытуцыі грубыя памылкі.

Вось, к прыкладу, газета «Красная Чувашия» на пытанню аб уласнасці піша: «Калгаснікі сталі разумець, як трэба адносіцца да соцыялістычнай і калгаснай уласнасці». Выходзіць, што, з аднаго боку, існуе соцыялістычная ўласнасць, а з другога — нейкая калгасная; і што калгасная ўласнасць, тым самым, не з'яўляецца соцыялістычнай. Гэта — грубейшае скажэнне. Сіла калгаснай уласнасці ў тым і заключаецца, што яна з'яўляецца формай соцыялістычнай уласнасці ў нашай краіне.

А вось якую бязглуздзіцу піша бакінская газета «Большевик нефти» (орган райкома АКП(б) і райпрамкома раёна імя Азізбекава):

«Убогая, жабрацкая Расія, у якой у першыя гады пасля соцыялістычнай рэволюцыі існавала 5 эканамічных укладаў,— натуральны капіталізм, прыватны капіталізм, — ператварылася ў магутную краіну свету, пануючай формай гаспадаркі ў якой з'яўляецца соцыялізм».

Возьмем асвятленне Канстытуцыі ў такой газеце, як «Легкая индустрия». Газета вялікая, маскоўская. У ёй быў змешчан артыкул Юрыя Круказа аб Канстытуцыі: «Уздым душэўных сіл». Аўтар гэтага артыкула, відаць, не толькі бязграматны чалавек, але і вялікі пашляк, умудрыўся Сталінскую Канстытуцыю, артыкул 118-ты — аб праве на працу, «увязаць» з «ідэяй» «прадоўжання жыцця да тэрміну, калі чалавек на граніцы жыцця будзе адчуваць патрэбнасць у смерці таксама проста, як патрэбнасць у сне». (Смех у зале).

У гэтым артыкуле бязграматнасць спаборнічае з пошласцю.

Справа, аднак, не толькі ў прамых памылках, але і ў агульным узроўні прапаганды ў газетах. І калі падыйсці з гэтага пункту гледжання да ацэнкі газет, то нават такая параўнаўча перадавая газета, як «Комсомольская правда», выхаваўчая роля якой для моладзі выключна вялікая, была справядліва раскрытыкавана Пленумам Цэнтральнага Камітэта комсамола ў верасні 1936 г. Пленум адзначыў, што прапаганда ў «Комсомольской правде» вядзецца павярхоўна, даюцца формулы і вывады замест талковага і сур'ёзнага растлумачэння, пераканання і прывядзення ў абгрунтаванне тых ці іншых палажэнняў і вываду гістарычнага і фактычнага матэрыялу, канкрэтных падзей, жывых прыкладаў і т. п.».

Весці газету на высокім ідэйным узроўні — гэта не значыць падносіць голыя формулы і лозунгі, нават калі яны правільна фармулююцца. Треба раз'ясняць і растлумачваць гэтыя лозунгі шляхам тэарэтычнага аналізу, гістарычных супастаўленняў, ілюстраваць іх фактамі, узятымі з жыцця, — вось што значыць весці газету на высокім ідэйным узроўні.

Звярнемся да такой сур'ёзнай справы, як антырэлігійная прапаганда. Пераважная большасць газет антырэлігійнай прапагандай не займаецца. Газеты, відаць, рашылі, што рэлігія ажывацца самацёкам і што нашы вялікія перамогі і поспехі на франтах соцыялістычнага будаўніцтва дазваляюць нам згарнуць антырэлігійную барацьбу. Гэта зусім няправільна.

Асабліва трэба спыніцца на асвятленні міжнародных пытанняў на старонках нашага друку. Гэта задача набывае зараз выключна важнае значэнне ў святле рашэнняў Пленума ЦК і ўказанняў таварыша Сталіна аб авалоданні большэвізмам. Треба павярнуць увагу ў старану вялікіх палітычных пытанняў міжнароднага характару. Справа гэта пастаўлена ў нашым друку, за рэдкімі выключэннямі, нездавальняюча.

Мы набліжаемся да выбараў у Саветы на новай Канстытуцыі. Гэта накладае на наш друк велізарнейшую адказнасць за падрыхтоўку да выбараў і сустрэчу іх ва ўсеўзбраенні. Некаторыя газеты наіўна думаюць, што ўсе многамільённыя масы выбаршчыкаў поўнасцю ўжо ўсвоілі вялікае значэнне і змест Сталінскай Канстытуцыі, і адсюль прышлі да вываду, што задача прапаганды Канстытуцыі цалкам вычарпана. Трэба разгарнуць вялікую работу па растлумачэнню Сталінскай Канстытуцыі. Кожны грамадзянін нашай краіны павінен ведаць, за каго ён будзе галасаваць і як ён будзе галасаваць; павінен ведаць, якімі правамі і абавязкамі ён, як грамадзянін Савецкага Саюза, карыстаецца.

Мы падыходзім да 20-годдзя Савецкай улады. Амаль кожны дзень 1937 года звязан якой-небудзь гістарычнай гадавінай. Перанясіцеся на 20 год назад, да бурных дзён 1917 года, насычанага вялікімі падзеямі рэволюцыйнай барацьбы. Нашы газеты павінны паказаць урокі гэтай гістарычнай барацьбы, расказаць пра яе новым пакаленням, дапамагчы шырокім масам на ўроках гэтай барацьбы атрымаць большэвіцкую ідэйную загартоўку. Аднак, прапаганда гісторыі большэвізму ў нашым друку далёка не на вышыні. Аб сур'ёзнасці задач, якія стаяць у гэтай галіне, ярка сведчыць апублікаванае ў «Большевике» пісьмо таварыша Сталіна па пытаннях гісторыі партыі.

Совецкі ўрад, у сувязі з датэрміновым выкананнем другой пяцігодкі і распрацоўкай трэцяга пяцігадовага плана, рашыў арганізаваць у друку абмеркаванне праблем трэцяй пяцігодкі. Гэта вельмі сур'ёзная справа, якая патрабуе ад усяго друку глыбокай работы.

Усё гэта паказвае, наколькі вялікую і рознастайную работу павінен правесці ўвесь наш друк, каб узняць свой ідэйны ўзровень на тую вышыню, якой патрабуе большэвіцкая партыя і безупынна ўзрастаючыя запросы нашага выдатнага чытача.

Умацаваць сувязі газет з масамі

Сувязь з масамі — асаблівая неад'емная якасць большэвіцкай газеты.

Выдатны вобраз таварыша Сталіна пра Антэя, героя грэчаскага міфа, сіла якога заключалася ў яго сувязі з мацерай-зямлёй. Мае самыя прамыя адносіны да нашага большэвіцкага друку. Сіла нашага друку— у яго неразрыўнай сувязі з масамі. Тая газета, якая траціць сувязь з масамі, якая падрывае гэту сувязь, перастае быць большэвіцкай газетай.

За апошні час ЦК ВКП(б) вынес два спецыяльныя рашэнні, якія непасрэдна датычаць умацавання масавых сувязей нашых газет. Гэта — рашэнне аб пісьмах у сувязі з абследаннем пермскай газеты «Звезда» і краявой газеты «Северо-кавказский большевик», і рашэнне аб аўтарскім актыве газет «Правда Севера» і «Горьковская коммуна». Гэтыя рашэнні гавораць аб тым, што ўказаныя газеты, а з імі і многія іншыя, забылі аб неад'емнай традыцыі большэвіцкага друку і сталі бюракратычна адносіцца да мас, — да пісем, да рабселькораў, да пазарэдакцыйнага аўтарскага актыва.

Характэрна, што за апошні час, у адпаведнасці з бурным ростам актыўнасці мас, неразрыўна звязаным з увядзеннем у жыццё Сталінскай Канстытуцыі, і з рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), падняўшымі новую хвалю самакрытыкі, — рэзка павялічваецца колькасць паступаючых у газеты пісем.

Такое-ж важнае значэнне, як работа з пісьмамі, мае і прыцягненне ў газеты новых аўтарскіх кадраў. Вось, к прыкладу, газеты «Горьковская коммуна» і «Правда Севера». На старонках гэтых газет друкаваліся адны толькі работнікі апарата рэдакцыі. У той-жа час за некалькі месяцаў у «Правде Севера», выпрыклад, былі надрукаваны толькі тры пісьмы партыйных работнікаў края. Аналагічная карціна і па «Горьковской коммуне». ЦК ВКП(б) адзначыў, што газеты «Правда Севера» (Архангельск) і «Горьковская коммуна», адгарадзіўшыся ад пазарэдакцыйнага аўтарскага актыва, дапусцілі грубейшае бюракратычнае скажэнне.

У чым сіла большэвіцкай газеты? У тым, што лепшыя мыслі, лепшы вопыт перадавых людзей нашай радзімы канцэнтруецца, збіраецца на старонках нашых газет. Толькі тады нашы газеты змогуць заззяць тымі яркімі рознастайнымі фарбамі, якімі гарыць жыццё нашай краіны ў яе безупынным імклівым руху наперад, калі яны стануць сапраўднымі арганізатарамі грамадзкай думкі і збіральнікамі ініцыятывы, вопыту, мыслей лепшых людзей. Але для гэтага рэдакцыі газет павінны шырока прыцягваць аўтараў з лепшых людзей краіны, края, вобласці, раёна, прадпрыемства. Трэба весці з аўтарскім актывам пастаянную работу, нястомна мацаваць з ім сувязь.

Пакончыць з падхалімствам, шырока разгарнуць большэвіцкую самакрытыку

Важнейшай задачай усяго нашага друку з'яўляецца смелае разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі. Гэтага рашуча патрабуе Лютаўскі Пленум ЦК ВКП(б) і таварыш Сталін.

Пленум ЦК адзначыў адну агідную хваробу, на якую хварэюць вельмі многія нашы газеты і рэдактары. Гэта — падмена большэвіцкай самакрытыкі антыбольшэвіцкай угодлівасцю і падхалімствам. Бадай, трудна знайсці газету, будзь-то абласную, ці нізавую, ці цэнтральную, якая не была-б грэшна па гэтай частцы. Але некаторыя газеты ў гэтых адносінах пабіваюць усе рэкорды, не вылечыўшыся і пасля Пленума ЦК ВКП(б).

Напрыклад, газета «Омская правда» і пасля Пленума ЦК не зжыла свайго падхалімства, развітага ў яе надзвычай моцна. У нумары 99 «Омская правда» ў невялікай заметцы «Перадавікі веснавой сяўбы на прыёме ў тав. Булатава» прозвішча тав. Булатава — першага сакратара абкома — ужыта 12 раз. У нумары 89 у маленькай заметцы аб прыёме піонераў прозвішча тав. Булатава ўпаміналася 21 раз. Гэта было да Пленума ЦК. А пасля Пленума газета ў справаздачы аб сходзе омскага партыйнага актыва ўхітрылася ўпамянуць імя тав. Булатава 13 раз. Рэдактар «Омской правды» тав. Шацкі, відаць, усё яшчэ не вынес урокаў з Пленума ЦК.

Самакрытыка — асноўны метад выхавання нашых кадраў, асноўны метад ва ўсёй нашай рабоце. Роля друку ў разгортванні самакрытыкі каласальная. Друк — рупар нашай грамадскай думкі.

Пасля Пленума ЦК ВКП(б) справа з разгортваннем самакрытыкі на старонках газет некалькі рушылася. Але гэтага зусім недастаткова. Многія работнікі друку ніяк не адважваюцца пусціцца ў плаванне па бурных хвалях самакрытыкі. На сходах актываў, на партыйных сходах самакрытыка разгортваецца астрэй і канкрэтней, чым у многіх газетах.

Смелая, большэвіцкая самакрытыка, не зважаючы на асобы, — абавязковая ўмова паваротy ў рабоце газет, якога патрабуюць рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

Вышэй культуру газет!

Для таго, каб наш друк быў на вышыні тых задач, якія ставіць зараз перад друкам партыя, ён павінен рашуча павысіць сваю культуру. Гэта перш за ўсё датычыць мовы нашых газет.

Не так ужо рэдкі выпадкі прамой непісьменнасці, дапускаемыя некаторымі газетамі. Што можна сказаць пра рэдактара тульскай раённай газеты (Маскоўская вобласць) тав. Байкова, які, змяшчаючы фельетон, ухітрыўся назваць свой літаратурны твор «фільетонам», тым самым ператварыўшы гэты нумар газеты ў хадзячы фельетон?

Але што гаварыць пра раённыя газеты, калі ў Маскве «Литературная газета», орган Саюза совецкіх пісьменнікаў, зусім не вылучаецца пісьменнасцю і прыгожасцю стылю. Ужо, здаецца, хто лепш газеты Саюза пісьменнікаў павінен быў-бы валодаць нашай чароўнай, вобразнай рускай мовай? У сапраўднасці-ж у «Литературной газете» нярэдка можна сустрэць такія перлы, што проста дзіву даешся, як гэта пісьменнікі церпяць, што іх орган размаўляе з імі такой суконнай, канцылярскай мовай. Вазьміце першамайскі нумар «Литературной газеты». Там адна фраза ў перадавым змяшчае 95 слоў і, на жаль, даволі мала сэнсу. Нелады з рускай мовай — частая з'ява на старонках «Литературной газеты».

Узорам большэвіцкай публіцыстыкі, захапляючай, вострай, яркай, трапнай, даступнай самым шырокім народным масам, з'яўляюцца артыкулы Леніна і Сталіна, у прыватнасці, іх артыкулы ў «Правде». Успомніце, як Ленін рэзка асуджаў непатрэбнае ўжыванне замежных слоў. А некаторыя нашы рэдактары ў пагоні за замежнымі словамі і, іншы раз нават не разумеючы іх сэнсу, залазяць у непраходныя нетры.

Нядаўна тав. Літвінаў атрымаў цікавае пісьмо беспартыйнага чытача газеты «Восточно-Сибирская правда»:

«Вамі, піша тав. Літвінаву аўтар пісьма, — у камісіі па абісінскаму пытанню было ўжыта выражэнне «гларыфікацыя вайны». Гэта выражэнне я разумею так: усхваленне, апяванне вайны, спяванне вайне хвалебных гімнаў.

Між тым, прыводзячы Вашу прамову на канферэнцыі ў Монтрэ, дзе гэта выражэнне вамі было паўторана, газета «Восточно-Сибирская правда» пасля слова гларыфікацыя змясціла ў дужках «давяршэнне». Прычым, ні тулунская раённая партарганізацыя (Усходне-Сібірская вобласць), куды я звярнуўся за растлумачэннем, ні адзін з многіх членаў партыі, да якіх таксама я зварачаўся па гэтаму пытанню, не далі мне, на маю думку, правільнага тлумачэння».

Гэта пісьмо — сур'ёзнае абвінавачанне рэдакцыі, якая блытае сваіх чытачоў, ня правільна паясняючы ім замежныя словы.

Таварышы газетчыкі, прыслухайцеся за гэтага пісьма радавога чытача з Тулунскага раёна, Усходне-Сібірскай вобласці! Яно датычыць многіх з вас.

Культура ў рабоце газет патрабуе своечасовага выхаду. Тут справа абстаіць зусім нецярпіма. Спазненні газет увайшлі ў парочную сістэму. Здавалася-б, у Дзень друку нашы цэнтральныя газеты пастараюцца выйсці своечасова. У сапраўднасці 5 мая без спазнення ў Маскве выйшла толькі адна газета — «Красная звезда». Усе астатнія газеты спазніліся. Газета «Водный транспорт» за ўвесь 1936 г. выйшла своечасова толькі... два разы.

У справе паляпшэння работы совецкага друку не малыя абавязкі кладуцца на ТАСС. Яго інфармацыя сістэматычна спазняецца, мае скажэнні. Жыццё СССР асвятляецца цмяна. Цэлы рад важнейшых падзей і з'яў у палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці нашай краіны ў інфармацыі ТАСС не знаходзіць ніякага адлюстравання. Яшчэ больш адказны задачы ТАСС у галіне міжнароднай інфармацыі. Работа ТАСС патрабуе карэннага паляпшэння ва ўсіх адносінах.

Перад нашым друкам стаяць найскладнейшыя і найадказнейшыя задачы барацьбы за рэалізацыю рашэнняў Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна, за ажыццяўленне палітычнага павароту ў сувязі са Сталінскай Канстытуцыяй.

Наш друк мае велізарныя сілы, сродкі магчымасці. Мы маем вялікую сетку газет. Трэба толькі ўсімі імі ўмела кіраваць і карыстацца так, як умеў і ўмее наш ленінска-сталінскі ЦК карыстацца большэвіцкай «Правдой» на ўсіх этапах яе работы — і ў 1912 годзе, і ў 1917 годзе і ў 1937 годзе.

Трэба ўзброіць газетныя кадры большэвізмам, каб яны маглі з гонарам выканаць ускладзеныя на іх партыяй адказнейшыя задачы. Гэта цяпер з'яўляецца галоўным. Але авалоданне большэвізмам — нялёгкая задача. Авалоданне большэвізмам даецца ў рэзультаце нястомнай, упартай сістэматычнай работы над сабой, пастаяннага вывучэння Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, усебаковага вывучэння міжнароднай абстаноўкі, актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці, непрымірымай барацьбы з лініяю партыі з яе ворагамі, з ворагамі народу.

Друк з'яўляецца самай вострай і самай моцнай зброяй нашай партыі. Гэта вызначэнне таварыша Сталіна шмат да чаго абавязвае ўсіх работнікаў совецкай прэсы.

Урачысты дзень 25-годдзя нашай слаўнай «Правды» абавязвае ўсіх работнікаў друку напружыць усе сілы, каб па-большэвіцку перабудаваць работу газет, выкарыстаць сталінскія ўказанні, авалодаць большэвізмам. І тады наш друк, на чале з ленінска-сталінскай «Правдой», пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі будзе яшчэ больш паспяхова згуртоўваць народы СССР пад вялікім сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна і весці іх да новых перамог комунізма. (Апладысменты).

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

БАРЫСАЎСКІ РАЁН

...зелізарнай актыўнасцю праходзілі ...чкі па справаздачнаму дакладу раённ... камітэта КП(б)Б.

...рок за крокам ускрывалі дэлегаты буй... ...ныя недахопы і памылкі ў рабоце РК. ...ін з іх былі вядомы бюро РК і да ...ерэнцыі, асабліва ў часе справаздач... ...ыбарчых сходаў пярвічных арга... ...цый. Але РК не ўзначаліў крытыкі і ...крытыкі, па сутнасці яе змазваў, а ...робных выпадках проста заціскаў. Рэа... ...цыю рашэнняў справаздачна-выбар... ...сходаў райком наогул адкінуў да ...ерэнцыі.

...д дэлегатаў выклікалі адсутнасць па ...ку таго, што бюро РК не налічыла па... ...ных дзесяці хаця-б да ведама вышэй... ...органа партарганізацыі — канфе... ...цыю аб такім факце, як вывад з чле... бюро і пленума РК ДражахрустА.

...з. Мархель (фабрыка імя Кірава), га... ...ны аб недахопах работы РК, зусім ...льна падкрэсліла, што ў Барысаўскай ...рганізацыі не выпрошчваўся актыў. ...м абапіраўся на вузкі круг людзей. ...тэтага сярод іх з'явіліся такія на... ...што яны «незамянімыя», самаўпэў... ...ць у тым, што без іх «не абойдуц... ...РК не ведае кадраў, бо кіраўнікі РК ...не бывалі ў пярвічных арганізацыях. Тав. Вегелей (фанерны завод), ілюс... ...чы гэта, расказаў, як работнікі РК, ...і бываючы на прадпрыемствах, нават ...чылі патрэбным пагутарыць з актыў... ...не гаворачы ўжо аб радавых камуні...

...агітацыйна-масавай і палітыка-выхаў... ...й рабоце на прадпрыемствах шмат ...ыя і кампанейшчыны. Нема і па... ...ага кіраўніцтва ў гэтай рабоце. Дэ... ...тав. Макухін паведаміў аб тым, як ...ведае «Чырвоны мэталіст» бясплатна... ...кіраўнікі чытку газет даручылі... сек...

...ладзіва абураліся дэлегаты такімі ...кі, як налічэнасць у горадзе прытонаў ...ганства, што затыўна выкарыстоў... ...ораг для сваёй шкодніцкай шпіён... ...дзейнасці. Між іншым з выступлен... ...ючых работнікаў дэлегаты так і ...ведаліся чаму РК КП(б)Б, РВК, га... ...совет і іншыя арганізацыі цярпіма ...ліся да гэтых злачынных з'явішчаў. ...рат райвыканкома, горсовета і іх ...аў перабудоўваюцца выключна дрэн... ...то не забяспечвае такой арганізацыі і палітычнай работы совета, якая ...дна ў сувязі з надыходзячымі выбарамі Сталінскай Канстытуцыі. Нажаль, ...шыя недахопы работы на вёсцы не ...а канферэнцыі дастаткова ўскрыты. ...гарнуўшаяся на канферэнцыі, асаб... ...м канцу спрачак, крытыка і самака... ...ка дала магчымасць ускрыць тое, ...тарэйшае агладзіў, ці абышоў у сва... ...ладзе сакратар РК тав. Майсееў: ...асць у РК прытулення шкодніцкіх ...ванне крытыкі, парушэнне статута ..., адрыў ад мас, групаўшчына і ...ніцыповая склока ў бюро РК. Аб ...умаўчалі ў сваіх выступленнях і ...бюро РК (Варанчык, Нехамкін, ...ін, Мельнікаў) і другі сакратар ...в. Лысак. Як высветлілася, тав. Лы... ...ак хацеў на канферэнцыі «вынесіць ...е з хаты», так як належаў да груп... ...ны ў РК.

...ныя дэлегаты гэтае пытанне — аб ...бюро РК, аб яго згуртаванасці і ...сці ЦК партыі — імкнуліся абсеці

...да абывацельскіх крыватолкаў, да кампанія ў дробязях і т. д. Гэтыя непартыйныя спробы крытыкі былі рашуча асуджаны і адкінуты пераважнай большасцю канферэнцыі.

Канферэнцыя таксама аднадушна ўхваліла рашэнне першічнай арганізацыі аб адводзе з канферэнцыі дэлегата Менжарыцкага, які абвінавачваецца ў троцкісцкай дзейнасці.

Буйнейшы недахоп спрачак — гэта адсутнасць даных аб тым, як працуе першічная арганізацыя пасля справаздачна-выбарчых сходаў.

Недастаткова аддана ўвагі ў спрачках палітычнаму выхаванню комуністаў і масавай рабоце сярод рабочых і калгаснікаў. Амаль абойдзена моўчкі работа сярод аднаасобнікаў, якіх у раёне налічваецца каля 20 проц.

Спрачкі па справаздачы РК скончыліся 18 мая вечарам. Выказалася 67 дэлегатаў з 90 запісаўшыхся.

Па сканчэнні спрачак адбыўся такі, заслугоўваючы ўвагі, выпадак. Не гледзячы на тое, што да канца пасяджэння аставалася 1 гадзіна 20 мінут, тав. Майсееў, спасылаючыся на адсутнасць у яго нейкіх дакументаў, заявіў аб немагчымасці рабіць заключнага слова. Канферэнцыя была вымушана перанесці сваю работу на наступны дзень.

19 мая канферэнцыя заслухала заключную прамову тав. Майсеева. У ёй тав. Майсееў прызнаў крытыку правільнай, пры гэтым заявіў, што недахопы справаздачнага даклада тлумачацца рашэннем Пленума РК не выносіць на канферэнцыю пытанне становішча спраў у бюро РК, «каб не ператвараць спрачкі на няправільнаму руслу» (?!). Як паказалі спрачкі, такі згавор папярэдзіў поўны крах.

Найўна прагучэла ў заключнай прамове тав. Майсеева сцвярджэнне аб тым, што яму быццам раней не былі вядомы ўскрытыя на канферэнцыі буйнейшыя прарывы і недахопы ў рабоце РК.

Тав. Майсееў, даўшы падрабязныя даведкі па высунутых супроць яго асабіста абвінавачваннях (якім ён прысвяціў пераважную частку заключнай прамовы), вымушан быў прызнаць, што зрабіў буйнейшую памылку, замаўчаўшы ў дакладзе налічэнасць у бюро РК групаўшчыны, беспрынцыповай склокі і іншых антыпартыйных з'явішчаў, якія надзвычайна адмоўна адбіліся на рабоце.

Рашэнне канферэнцыі работа раённага камітэта прызнана незадавальняючай.

* * *

У выніку актыўнага ўсебаковага абмеркавання кандыдатур у спіс для тайнага галасавання з 64 высунутых уключана 38. Тав. Лысак (другі сакратар РК) прасіў канферэнцыю зняць яго кандыдатуру са спісу для тайнага галасавання. Сваю просьбу ён матываваў тым, што не мае якасцей большэвіцкага кіраўніка. Канферэнцыя задаволіла просьбу тав. Лысака і зняла яго кандыдатуру са спісу.

20 мая вечарам канферэнцыя прыступіла да тайнага галасавання. Калі была раздана амаль палова выбарчых бюлетэняў, высветлілася, што ў іх памылкова ўключан адзін дэлегат, адведзены пры папярэднім абмеркаванні. Галасаванне было прыпынена. Пасля выпраўлення памылкі было праведзена тайнае галасаванне занача кадруваным выбарчымі бюлетэнямі.

Ал. ЛЕБЕДЗЕЎ.

МОЗЫРСКІ РАЁН

...раённым пасяджэнні канферэнцыі ...н завяршыўся абмеркаванне кандыдатур у склад дэлегатаў на Мозырскую ...вую партканферэнцыю з правам ...ага голасу. У спіс для тайнага га...ння было ўключана 127 кандыда...годна модуса прадстаўніцтва, трэба ...ь 120 дэлегатаў. Результаты галасавання паказалі, што за 120 кандыдатур ...ала абсалютная большасць дэлегатаў канферэнцыі. Сярод выбраных дэлегатаў ...закруговую партканферэнцыю — ...ры ЦК КП(б)Б тав. Шарангові ...ч. Значная частка дэлегатаў — ...партработнікі, комуністы — стар...льсоветаў і калгасаў, радавыя ра...работніцы і калгаснікі.

...ятыя рэзалюцыі ў канчатковай ...ы, канферэнцыя позна вечарам 19 ...кончыла сваю работу. Адзначаючы зусім недастатковую перабудову партыйнай работы, канферэнцыя абавязала ўпоў выбраны райком і ўсе першічныя партарганізацыі разгарнуць сапраўдную большэвіцкую барацьбу за неадкладную рэалізацыю рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

* * *

Дзень 20 мая адбыўся арганізацыйны пленум райкома, на якім былі праведзены выбары бюро райкома партыі.

У склад бюро тайным галасаваннем абрана 7 асоб: Ананьеў (сакратар акружкома партыі), Левін, Гольшварц (рэдактар акруговай газеты), Буякоў (старшыня РВК), Малашонак (дырэктар МТС), Грук і Шалевіч.

Першым сакратаром райкома аднагалосна абран тав. Левін.

Культпропам райкома зацверджан тав. Груп.

ЭРАЛОЎ.

ВІЦЕБСК

...мая адбыліся выбары кандыдатаў ...а партыі. У результаце тайнага га...ння абраныя аказаліся 5 чала... ...брана таксама рэвізійная камісія ...ь.

...ференцыя зацвердзіла канчатковы ...езалюцыі па справаздачнаму дакла...ому партыі. У рэзалюцыі адзнача...а гарком партыі сваю работу яшчэ ...абудаваў у адпавядзнасці з рашэн...ленума ЦК ВКП(б). Гарком партыі ...аба звязан з пярвічнымі партарга...мі, у сваёй рабоце меў рад памы...арушаўся статут партыі і ўнутры...ная дэмакратыя. У результаце ...лення пільнасці доўгі час не былі ...ы ворагі партыі і рабочага кла...трацкісты і іншыя контрэволюцыйны...олач, якая арудвала ў Віцебску. ...ым з іх былі выданы партдаку...новага ўзору. Крытыка і сама...крытыка ў партарганізацыі была разгорнута слаба.

У рэзалюцыі адзначан рад канкрэтных мерапрыемстваў па перабудове ўсёй арганізацыйнай партыйна-масавай работы, падняццю рэвалюцыйнай пільнасці, выкарчоўванню астаткаў шкодніцтва, няўхільнаму выкананню рашэнняў Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), указанняў таварыша Сталіна, адзначаных у яго гістарычным дакладзе і заключным слове.

На вячэрнім пасяджэнні прадаўжалася абмеркаванне кандыдатур дэлегатаў на з'езд КП(б)Б. Усяго ў спіс высунута 154 чалавекі. Патрэбна абраць 63 чалавекі з рашаючым голасам і 11 з дарадчым. Канферэнцыя, як і ў папярэднія дні, праходзіць з вялікай актыўнасцю і арганізавана.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

НЕАБГРУНТАВАНАЕ АБВІНАВАЧАННЕ

...справаздачна-выбарчым сходзе парт...цыі Наркомасветы БССР многа га...ся аб Шэўчыку, як аб трацкісце. ...авіка ў газеце «Звязда» быў зме...ртыкул аб гэтым сходзе пад зага...«Да канца выкрыць і выправіць ...і», дзе пры вылажэнні прамовы ...сакратара парткома тав. Пармона ...: «Падручнік трацкіста Шэўчыка ...а выдання на 1937 год».

...ык заявіў рэдакцыі пратэст су...такога страшэннага яго абвінава...У сувязі з гэтым рэдакцыя звярнулася да тав. Пармона, але ён не пажадаў абвергнуць сваёй заявы, не прадставіўшы, аднак, нічога ў пацвярджэнне сваіх слоў. Як устаноўлена зараз, Шэўчык сапраўды ў 1927 годзе хістаўся ў бок трацкізма, за што зусім правільна быў выключан з комсамола. У людзей так памяць пабудавана, што мінулага яны не забываюць. Аднак, мінулыя памылкі яшчэ не даюць падставы для абвінавачванняў, падобных тым, якія высунуў супроць Шэўчыка тав. Пармон у даны момант.

СЛУЦКАЯ АКРУГА

19 мая адкрылася другая слуцкая акруговая партыйная канферэнцыя. Са справаздачным дакладам аб рабоце АК КП(б)Б выступіў сакратар акружкома тав. Каменштэйн.

Учора 20 мая пачаліся спрачкі па справаздачы акружкома. Значнае месца ў спрачках займаюць пытанні палітычнай агітацыі. Палітычная агітацыя—слабы ўчастак работы акруговай партыйнай арганізацыі. Гэта вымушан быў прызнаць у сваім дакладзе і тав. Каменштэйн. Калі палітагітацыя колькі-небудзь ахапляла больш буйныя і недалёкія калгасы, то ў далёкіх, больш дробных калгасах, вёсках, пасёлках яе амаль не было. Такія калгасы па году не бачылі агітатара. Сярод аднаасобнікаў палі агітацыя зусім не была арганізавана, хоць аднаасобных гаспадарак у акрузе пяць з паловаю тысяч.

Не можа акруговая партыйная арганізацыя пахваліцца пастаноўкай палітагітацыі сярод іншых пластоў працоўнага насельніцтва — служачых, членаў прамарцелеў, хатніх гаспадынь і т. д.

У акрузе ёсць 157 хат-чытальняў і дамоў соцкультуры. Гэта матэрыяльная база для правядзення палітмасавай работы ка вёсцы зусім дрэнна выкарыстоўваецца з прычыны адсутнасці належнага кіраўніцтва і ўвагі з боку акружкома і райкомаў да пытанняў палітычна-масавай работы на вёсцы.

Аб нізкім узроўні палітычнай агітацыі ў масах гаворыць зад дэлегатаў.

— Акруговы камітэт партыі,—кажа тав. Семашка, старшыня Валіка-Раёўскага сельсовета, Копыльскага раёна,— выносіў нямала пастаноў аб палітычна-масавай рабоце. Уся бяда ў тым, што ён не правяраў, як гэтыя пастановы выконваюцца. У мінулым годзе акрутком вызначыў для нас трох адказных таварышоў для правядзення сходаў калгаснікаў з дакладамі аб XIX гадавіне Кастрычніка. Мы вельмі ўзрадаваліся. Калгаснікі чакалі, але дакладчыкі не з'явіліся і сходы былі сарваны. Напярэдадні 1 мая гэтага года акрутком такім-жа чынам сарваў даклад у буйнейшым калгасе нашага сельсовета. Каму патрэбны такія абяцанні, пастановы, якія не выконваюцца?!

— Палітагітацыяй у нас займаюцца павярхоўна — гаворыць тав. Сігаеў— начальнік палітаддзела соўгаса імя Дзержынскага, Копыльскага раёна,—акружком мала цікавіўся якасцю, зместам, кадрамі палітагітацыі. Яго прыкладу следуюць райкомы. У лепшым выпадку праводзіцца інструктаж агітатараў. Не ідзе, што былі факты, калі правядзенне гутарак, дакладаў даручалася некваліфікаваным, а часамі і неправераным людзям, якія груба сжажалі агітацыю. Акружком абавязан быў глыбока прадумаць пытанні падбору і падрыхтоўкі кадраў для палітычнай агітацыі ў масах. Гэта не было зроблена.

Нездавальняючай пастаноўкай партыйна-масавай работы ў нашым соўгасе карысталіся класава-варожыя элементы ў сваіх антысовецкіх мэтах. Праводзячы сяк-так агітацыю сярод рабочых, мы поўнасцю ігнаравалі палітагітацыю сярод спецыялістаў соўгаса, лічылі, што яны абыйдуцца без нас. Мы цяпер востра адчуваем усю шкоднасць такіх настрояў. Пасля Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) мы палепшылі партыйна-масавую работу, пастараліся зрабіць агітацыю больш цікавай, ідэйнай, канкрэтнай. Але-ж гэта толькі першыя нясмелыя крокі нашай перабудовы.

— Як акругком, райкомы, інструктары займаліся пытаннем палітычнай агітацыі ў масах не цяжка меркаваць па падбору кадраў для вясковых дамоў соцкультуры,—гаворыць інструктар Слуцкага райкома т. Шведак.—Вось некаторыя факты з Слуцкага раёна. Загадчыкам дома соцкультуры калгаса «Рухавік», Веражанскага сельсовета, быў пасланы чалавек, якога хутка выкрылі, як прайдзісвета. Работу ён разваліў.

У Бокшіцкім сельсавеце загадчыкам дома соцкультуры быў пасланы актыўны таварыш, член партыі тав. Бранкевіч. Прапрацаваў ён там толькі два месяцы і паказаў узоры добрай работы. Дом соцкультуры стаў сапраўдным цэнтрам агітмасавай работы ў сельсавеце, шырока разгарнулася самадзейнасць калгаснікаў. Здавалася-б, што вопыт яго работы трэба зрабіць здабыткам іншых дамоў соцкультуры. Але гэтага не здарылася. Тав. Бранкевіча забіраюць, на яго месца ставяць нездольнага чалавека, які звёў на нішто добрае пачынанне.

Або вось калгас «Ударнік», Дарасінскага сельсовета. Асабліва тут антысовецкія элементы—царкоўнікі—імкнуцца ўзяць над сваёй уплыў насельніцтва. Сярод моладзі, якой няма куды дзецца, развіта п'янства і хуліганства. А між тым у калгасе ёсць добрае памяшканне пад клуб. Уся бяда ў тым, што не закончана ўнутранае абсталяванне. І вось з-за гэтай дробязі правальваецца ўся работа.

Аб нізкім узроўні палітычнай агітацыі ў масах, нездавальняючым кіраўніцтве з боку акружкома гаварылі іншыя дэлегаты ў сваіх выступленнях.

Пасля Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) акрутком некалькі палепшыў кіраўніцтва палітагітацыяй. Але пакуль што зроблены толькі першыя крокі. Каб кожны комуніст стаў сапраўдным вожаком мас, каб да надыходзячых выбараў у саветы па новай Канстытуцыі ахапіць сваім уплывам, глыбока ідэйнай, цікавай і канкрэтнай палітагітацыяй усіх пластоў насельніцтва,—такой перабудовы акружком партыі пакуль не дабіўся. Не навучыў гэтаму партыйную арганізацыю. І за гэта дэлегаты ў сваіх выступленнях справядліва яго крытыкуюць.

ШЛЯФЕР.

МАГІЛЕЎСКІ РАЁН

МАГІЛЕЎ, 20. Сёння адкрыўся раённы сход сельскай партарганізацыі. Паводле пастановы ЦК ВКП(б) і КП(б)Б, у Магілеве стварэцца сельрайком партыі. Сход сабраўся на заслуханне справаздачы райкома выбараў сельрайкома, рэвізійнай камісіі і дэлегатаў на з'езд КП(б)Б.

Да моманту адкрыцця сходу з'явіліся 243 члены і кандыдаты партыі. Не з'явілася 44 чал., з іх 20 па ўважлівых прычынах. Выбары кіруючых органаў сходу занялі адну гадзіну. У часе выбараў выявілася, што некаторыя комуністы не зразумелі рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў ЦК аб парадку выбараў.

Сёння сход заслухаў справаздачу сакратара райкома тав. Кузьміна.

Р. ДОЛЗІН.

ПЛАНАВАЦЬ РАМОНТ ЖЫЛЛЁВАЙ ГАСПАДАРКІ

У друку не раз узнімалі пытанне аб разбурэнні жыллёвай гаспадаркі, аб павольным будаўніцтве лазняў. Але плануючыя арганізацыі не адпускаюць на рамонты ні цэменту, ні дошак, ні цвікоў, а дамы развальваюцца. Калі плануюць пабудову новага дома, то ў гэты-ж час выходзяць са строю тысячы метраў старой жыллошчы.

Даўно ўжо ў Менску ні адзін дах не перафарбоўваўся, не гаворачы ўжо аб іншых гарадах. Сотні дамоў працякаюць, псуецца дэфіцытнае жалеза. У многіх дамах няспраўныя водасточныя трубы, вада цячэ проста па сцяне, разбурае яе.

Ніхто не займаецца рамонтам лазняў і пральняў. У лепшым выпадку направяць дах і на гэтым канчаецца. Лазні маюць нядобры выгляд: чорныя сцены, закопчаныя столі, замест кранаў тырчаць кіі. Адсутнічаюць пакоі для адпачынку пасля мыцця.

Калі звяртаешся ў Дзяржплан за атрыманнем хоць якіх-небудзь фондаў для комунальных прадпрыемстваў, то тут і слухаць не хочуць.

За апошнія гады ў Менску пабудавалі некалькі вялікіх жыллёвых дамоў (Дом спецыялістаў, Дом горсовета і інш.). Але-ж будаўнікі не прадугледзелі такой «дробязі», як пральні. А ў іх адчуваецца найвялікшая патрэба. Зараз мы сустракаемся з такой з'явай, калі кожная гаспадыня павінна мыць сваю бялізну ў невялічкай сумеснай кухні на 8—10 жыхароў. Зразумела, што жыллошча хутчэй разбураецца ад такога гаспадарання.

Пры складанні плана трэцяй пяцігодкі Дзяржплану неабходна ўлічыць пытанні комунальнага будаўніцтва і ў першую чаргу скончыць закансерваваныя будоўлі, у якія ўкладзена многа сродкаў.

А. Г. СЛАВІН.

КАЛІ-Ж УСТАНОВЯЦЬ ВЕНТЫЛЯТАР?

ПОЛАЦК. Прачытаўшы ў «Праўдзе» артыкул: «Дымоуловители на электростанциях г. Москвы» я рашыў напісаць і аб нашай полацкай электрастанцыі.

Дызель станцыі працуюць на кафце і вечарамі, у машынным зале накапляецца столькі адпрацаванага газу, што машыніст не бачыць за два метры ад сябе свайго пакочніка. Каб вызваліцца ад дыму, рабочыя расчыняюць усе вокны і дзверы, але і гэта не дапамагае.

Яшчэ ў 1934 годзе было затрачана некалькі тысяч рублёў на ўстаноўку вентылятара, але-ж ён хутка вышаў са строю. У мінулым годзе Белэнергатрэст зацвердзіў праект і смету на ўстанаўленне новага вентылятара. На гэту справу патрэбна паўтары тоны жалеза. Трэст чамусьці нам не вызначыў жалеза, а аддаў іншым арганізацыям.

Зараз нам прапануюць усталяваць вентылятары ў вокнах. Амаль што на вожнай вытворчай нарадзе рабочыя гавораць аб гэтым, але ніхто не лічыць патрэбным палепшыць умовы працы рабочых нашай электрастанцыі.

ДАУЦІН Б. І.

ПРАВЕРАЧНЫЯ ІСПЫТЫ У ШКОЛАХ

У «Праўдзе» ад 19 мая апублікаван артыкул народнага камісара асветы РСФСР тав. А. Бубнова аб праверачных іспытах у школах. Тав. Бубноў акрэслівае важнейшыя задачы, якія стаяць перад школамі і аддзеламі народнай асветы ў правядзенні сёлетніх іспытаў.

Асаблівая ўвага павінна быць аддана правільнасці ацэнкі ведаў вучняў. Недапушчальна, каб скончыўшыя 10 клас незаслужана атрымлівалі атэстаты выдатнікаў з правам паступлення ў ВНУ без іспытаў. Дырэктар, загадчык школы і загадчык навучальнай часткі павінны ўважліва сачыць за правільнасцю ацэнкі ведаў, выпраўляючы на-ходу заўважаныя недахопы.

Па прыкладу мінулага года на іспыты ў школы буйнейшых гарадоў трэба запрасіць прафесароў і дацэнтаў з вышэйшых навучальных устаноў.

У школах уся работа павінна быць арганізавана так, каб вучань у часе іспытаў пры ўсіх узнікшых цяжкасцях і незразумелых пытаннях атрымліваў дапамогу, сустракаў чулыя і ўважлівыя адносіны з боку дырэктара, настаўніка, класнага кіраўніка, комсорга, піонерскай і комсамольскай арганізацый.

Перыяд праверачных іспытаў працягваецца значны час. Гэты час трэба максімальна скарыстаць для ліквідацыі другагодніцтва, арганізаваўшы ўсебаковую дапамогу тым вучням, якія на працягу года адставалі па тых ці іншых дысцыплінах.

Па сканчэнні іспытаў вучні павінны своечасова атрымаць атэстаты, выпускныя пасведчанні і пахвальныя граматы. Своечасовасць іх выдачы павінны забяспечыць НКА і аддзелы народнай асветы.

Падвядзенне вынікаў і выдачу атэстатаў трэба прыўрочыць да школьных свят, прысвечаных сканчэнню навучальнага года. Гэтыя святы павінны прайсці цікава і арганізавана. На сходах в аддзелам бацькоў дырэктары школ павінны зрабіць справаздачы аб выніках гадавой работы школ.

Аддзелы народнай асветы павінны ўзняліва падвесці вынікі навучальнага года, вывучыць вопыт перадавых настаўнікаў, прааналізаваць адмоўныя бакі ў рабоце школ з тым, каб усе заўважаныя недахопы ў наступным годзе былі выпраўлены.

Узорным правядзеннем праверачных іспытаў і пасляіспытным завяршэннем навучальнага года настаўніцтва дастойна адзначае на вгодавіны партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна аб нашай школе.

Указанні тав. Бубнова павінны быць улічаны пры правядзенні праверачных іспытаў у школах БССР.

ХТО ПІСАЎ ТАКІ ЗАГАД?

Восем месяцаў Наркомасветы зацвярджае рашэнне камісіі па атэстацыі настаўнікаў Лельчыцкага раёна. У выніку такой «лыпатлівай» работы мы атрымалі загад 5 мая 1937 г. за № 486, які не мог не здзівіць настаўнікаў раёна.

Прыведзем прыклады. Рашэннем камісіі па атэстацыі працуючаму ў школе Абчыцу Рыгору званне настаўніка пачатковай школы не прысвоена. Два месяцы таму назад ён быў знят з работы загадам НКА. Цяпер-жа загадам ад 5 мая Абчыцу прысвойваецца званне настаўніка пачатковай школы і дазваляецца выкладаць гісторыю і геаграфію ў старэйшых класах. Такое-ж рашэнне ў загадзе ад 5 мая і ў адносінах былога настаўніка Зуева, які больш паўгода таму назад арыштаваны органамі НКУС. Ні на адну дакладную і тэлеграму аб замене знятых настаўнікаў Наркомасветы не адказаў.

У загадзе, аб імя ідэе гутарка, хопшых настаўнікам раёна (Роут і інш.) якраз званне настаўнікаў пачатковых школ не прысвоена, не гледзячы на рашэнні атэстацыйнай камісіі.

Астаецца незразумелым і 10 пункт загаду, дзе прапануецца раёна прадставіць на зацвярджэнне кандыдатуры настаўнікаў замест знятых з работы. Няўжо Наркомасветы не ведома, што ў старэйшых класах Глушнавіцкай НСШ працуе ўсяго адзін настаўнік, што ў Буйнавіцкай школе на працягу ўсяго года не выкладаецца гісторыя, не ўсе прадметы выкладаюцца ў Усаўскай НСШ і інш?

А. ЛОРМАН.

АД РЭДАКЦЫІ. Сігналы з Лельчыцкага раёна — яскравае сведчанне таго, што вораг прыклаў сваю руку ў справе атэстацыі настаўнікаў. Наркомасветы павінен дакладна праверыць гэты сігнал і прыняць усе меры да ліквідацыі шкодніцтва ў гэтай галіне.

У МОЗЫРЫ НЕ КЛАПОЦЯЦЦА АБ ПАЗЫКАТРЫМАЛЬНІКАХ

Асталіся лічаныя дні да першага тыража пазыкі Другой пяцігодкі (выпуск 4-га года). Абавязак работнікаў ашчадных кас, фінансавага актыва, камісій садзейнічання, профсаюзных і совецкіх арганізацый — забяспечыць удзел у тыражы ўсіх працоўных. Але гэтай вялікай адказнасці не адчуваюць у Мазырскім раёне. Тут прасталі падрыхтоўку да тыража. У раёне можна назваць рад калгасаў і калгаснікаў, якія нават яшчэ зараз не абмянялі аблігацыі ранейшых пазык на аблігацыі новага выпуску.

Калгаснікі сельгасарцелі «Наша ніва», Нахаўскага сельсовета, не атрымалі аблігацый па падпісцы 1935 года на суму 365 руб. Калгаснік сельгасарцелі «Правда», Гулевіцкага сельсовета, Наўныка Сяргей мае старых аблігацый на суму 105 руб. і не ведае дзе іх абмяняць. Мазырская райашчадкаса палец аб палец не ўдарыла, каб шырока давесці да кожнага працоўнага раёна аб тыражы і аб абмене старых аблігацый.

І. П. ХАДЗЬКОЎ.

Калгас «Правда», Гулевіцкага сельсовета, Мазырскага раёна.

Па-большэвіцку рыхтавацца да тыража пазыкі

25 мая ў Маскве адбудзецца тыраж Пазыкі другой пяцігодкі (выпуску 4 года). Гэта — першы тыраж пасля праведзенай канверсіі раней выпушчаных масавых пазык.

Падрыхтоўка да першага тыража з'яўляецца зараз адной з адказнейшых задач усіх партыйных, совецкіх, профсаюзных арганізацый і, у першую чаргу, фінансавых органаў і ашчадкас.

З вялікай арганізаванасцю прайшла канверсія (абмен) аблігацый ранейшых масавых пазык па БССР. Па даных на 11 мая г. г., аблігацыі абмянялі 1.281 тыс. чалавек звыш чым на 311 мільёнаў рублёў.

У часе абмену аблігацый па БССР выяўлена і аплочана трымальнікам пазык выйгрышаў, процантаў і тыражны кошт аблігацый на суму каля 8 мільёнаў рублёў.

Аднак, у правядзенні канверсіі ёсць нямала недахопаў. У Петрыкоўскім, Чавускім, Гарадоцкім, Ельскім і Чэрвеньскім раёнах, напрыклад, значная частка аблігацый, што знаходзяцца на руках у насельніцтва, яшчэ не абменена.

Асноўная задача фінансавых органаў і ашчадных кас заключаецца зараз у тым, каб забяспечыць удзел у тыражы ўсіх трымальнікаў аблігацый дзяржаўных пазык, якія знаходзяцца як на руках у насельніцтва, так і на хаванні ў ашчадкасах.

Важнейшай задачай у заключным этапе пазыковай кампаніі з'яўляецца поўная раздача аплочаных аблігацый на рукі падпісчыкам.

На аснове аператыўных даных, трэба канстатаваць, што раздача аблігацый рабочым, служачым, калгаснікам праходзіць з вялікай актыўнасцю, пры ўдзеле фінансавага актыва і грамадскіх арганізацый прадпрыемстваў, устаноў і калгасаў. У Віцебску на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» ва ўсіх цэхах праведзены спецыяльныя гутаркі аб значэнні надыходзячага тыража. Партком фабрыкі правёў спецыяльную інструкцыйную нараду з палітбяседчыкамі фабрыкі. Аблігацыі раздаваліся непасрэдна ля станка. Камсод фабрыкі падрыхтаваўся да правядзення масавай праверкі аблігацый па тыражных табліцах пасля тыража.

У Рэчыцы на фабрыцы «Х Кастрычнік» аблігацыі былі разданы рабочым і служачым таксама ля станка. Якія адсутнічалі часова па хваробе, або па іншых прычынах, тым аблігацыі дастаўляў камсод на дом. Грамадскасць фабрыкі актыўна рыхтуецца да правядзення масавай праверкі выйгрышаў пасля першага тыража.

Але разам з гэтым мы маем рад фактаў і сігналаў аб тым, што аблігацыі нясвоечасова раздаюцца на рукі падпісчыкам, а ў паасобных выпадках нават затрымліваюць іх выдачу.

Загадчыкі райашчадкас Барысаўскага, Быхаўскага, Вялыніцкага, Клімавіцкага, Петрыкоўскага, Бабруйскага і іншых раёнаў праяўляюць паўнейшую бясклопатасць у раздачы аплочаных аблігацый. Напрыклад, у Бабруйскім раёне раздана аблігацый калгаснікам на 155 тыс. руб., а паступіла грошай 240 тыс. руб.; у Крычаўскім раёне (загадчык т. Наркевіч) выяўлена, што ў двух сельсоветах аблігацыі ляжалі нераздаными ў канцылярыях калгасаў. У Асвейскім раёне ў калгасе імя Куйбышэва рад калгаснікаў не атрымалі аплочаных аблігацый. Такі сігнал ёсць і ад калгаснікаў сельгасарцелі «1 мая», Кабышчанскага сельсовета, якія ўнеслі па падпісцы 1620 руб., але аблігацый сваіх яны яшчэ не атрымалі.

У некаторых раёнах назіраецца антыдзяржаўная практыка. Унесеныя рабочымі і служачымі Высачанскай машынна-трактарнай станцыі 2.300 рублёў па падпісцы на пазыку былі скарыстаны на гаспадарчыя патрэбы.

СНК БССР яшчэ 9 красавіка прапанаваў старшыням акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў і горсоветаў узмацніць кантроль за паступленнем узносаў па падпісцы на пазыку ад калгаснікаў і аднаасобнікаў і забяспечыць шырокую папулярызацыю надыходзячага тыража. Аднак, у радзе раёнаў гэта дырэктыва яўна ігнаруецца, збор узносаў па пазыцы зрываецца (Добрушскі падпіску на пазыку па калгаснікам пакрыў толькі на 39,1 проц., Жлобінскі на 40,3 проц., Рагачоўскі на 38,1 проц., Чачэрскі на 46,1 проц., Чэрвеньскі на 49,8 проц., Гарадоцкі на 46,8 проц. і інш.).

Задача фінорганаў і ашчадкас заключаецца зараз у тым, каб да тыража забяспечыць поўны збор узносаў па пазыцы ад калгаснікаў і аднаасобнікаў і неадкладна раздаць на рукі падпісчыкам аплочаныя аблігацыі.

У выключных выпадках, калі будзе ўстаноўлена немагчымасць уручэння аблігацый на рукі падпісчыкам, прадпрыемствы, установы, сельсоветы, калгасы павінны не пазней 23 мая здаць гэтыя аблігацыі ў цэнтральныя і раённыя ашчадкасы пры пратаколах камсодаў, якія сведчаць аб прычынах немагчымасці ўручэння аблігацый.

Падпісчыкі павінны памятаць, што аблігацыі здаюцца ў ашчадкасу ў абязлічаным выглядзе. Права на атрыманне з ашчадкасы аблігацый захоўваецца за падпісчыкамі толькі да 1 чэрвеня 1938 года.

Неабходна шырока папулярызаваць аб тым, што тыя трымальнікі аблігацый дзяржаўных унутраных пазык, якія заклалі часова свае аблігацыі і атрымалі ў ашчадкасах ссуды, у выпадку нявыкупу іх пазбаўляюцца права прымаць удзел у тыражы выйгрышаў, а аблігацыі, якія зданы ў забеспячэнне сваёй ссуды паступаюць у партфель ашчадных кас. Пры пагашэнні ссуды трымальніку дзяржаўных пазык выдаюцца новыя аблігацыі на роўную суму з правам удзелу ў далейшых тыражах.

Камсоды, профсаюзы павінны шырока папулярызаваць, што ў першым тыражы будзе разыгран адзін мільён выйгрышаў на суму ў 164 млн. 920 тыс. руб., у тым ліку: 200 выйгрышаў па 3.000 руб., 1000 выйгрышаў па 1000 руб., 10.000 выйгрышаў па 500 руб., 200.000 выйгрышаў па 200 руб., 788.800 выйгрышаў па 150 руб.

Сістэма ашчадкас і дзяржкредыта, камсоды павінны добра падрыхтавацца да арганізацыі праверкі аблігацый па тыражных табліцах і аплаты выйгрышаў. Неабходна разгарнуць даведачную сетку, максімальна яе пашырыўшы ў ашчадкасах, на прадпрыемствах, установах, калгасах, клубах, чырвоных кутках і т. д.

Да пачатку тыража астаецца мала часу. Трэба прыйсці да тыража без адзінай капейкі запазычанасці па пазыцы, раздаць поўнасцю аплочаныя аблігацыі і абмяняць усе да гэтага часу не абмененыя аблігацыі.

Сістэма ашчадкас і дзяржкредыта павінна прыняць усе меры да палепшання абслугоўвання трымальнікаў аблігацый дзяржаўных пазык; рашуча перабудаваўшы сваю работу, чоткі і культурна абслугоўваць працоўных, праяўляць штодзённыя клопаты да кожнага трымальніка аблігацый.

ГАЕЎ.

Начальнік сектара дзяржпазык Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыта НКФ БССР.

ЗА РУБЯЖОМ

УРАД ПЕРАМОГІ

Ва ўчарашніх газетах апублікован склад новага ўрада рэспубліканскай Іспаніі. Галавой урада з'яўляецца сацыяліст Хуан Негрын—міністр фінансаў у былым урадзе Ларго Кабальеро. У новы габінет увайшлі 3 сацыялісты. 2 камуністы і 4 прадстаўнікі іншых партый народнага фронта, у тым ліку баскскіх нацыяналістаў — прадстаўнікі ўсіх антыфашысцкіх партый.

Не ўвайшлі ў склад габінета былы прэм'ер Ларго Кабальеро і былы міністр замежных спраў Альварэс Дэль Вайо.

Чым выклікан урадавы крызіс у Іспаніі? Чаму Ларго Кабальеро не ўдалося стварыць новы ўрад, і ён быў вымушан адмовіцца ад гэтай місіі?

Урадавы крызіс выклікан перш за ўсё памылкамі ў палітыцы Ларго Кабальеро, яго хістаннямі і нерашучасцю. Рэзультатамі гэтых памылак з'яўляюцца — крывавы путч трацкісцка-фашысцкіх элементаў у Барселоне, бясчынствы крайніх анархісцкіх элементаў, ажыўленне дзейнасці «5 калоны» у радзе гарадоў Іспаніі, пасіўнае становішча арагонскага, паўднёвага і іншых франтоў, нездавальняючае становішча прамысловасці і інш. Урад Ларго Кабальеро не мог такім чынам забяспечыць хутчэйшую перамогу.

Падзеі ў сталіцы Каталоніі—Барселоне з'яўляюцца бліжэйшым поводам да адстаўкі ўрада. Камуністычная партыя Іспаніі патрабавала прыняць самыя энергічныя меры да ліквідацыі контррэволюцыйных элементаў, да ачышчэння тылу, да актывізацыі ваенных франтоў, да скарэйшай арганізацыі ваеннай прамысловасці і нацыяналізацыі рашаючых галін яе.

Урад Ларго Кабальеро не праводзіў у жыццё гэтых патрабаванняў комуністычнай партыі. Вось чаму комуністычная партыя пры падтрымцы велізарнай бальшасці народу прымушана была паставіць пытанне аб давер'і ўраду.

Калі Ларго Кабальеро было даручана стварыць новы габінет, ЦК компартыі перадаў яму свае патрабаванні па пытанню аб складзе і палітыцы новага ўрада. Ларго Кабальеро адмовіўся прыняць гэтыя патрабаванні і тым самым адмовіўся ад спроб стварэння габінета.

У новы ўрад не ўвайшлі прадстаўнікі прафесіянальных саюзаў — усеагульнага рабочага саюза, і анархісцка-сіндыкалісцкай канфедэрацыі працы, кіраўнікі якіх адарваліся ад мас і зусім не выражаюць імкненняў сваіх членаў, якія падтрымліваюць палітыку комуністычнай партыі.

Новы ўрад у сваёй дэкларацыі заяўляе, што ён з'яўляецца аўтарытэтным прадстаўніком усіх палітычных партый, якія аб'ядналіся з мэтай падаўлення мяжежу, забеспячэння свабоды народу і абароны незалежнасці Іспаніі. Галоўная місія яго заключаецца ў тым, каб прывесці народныя масы да перамогі над мяжежнікамі і замежнымі інтэрвентамі.

Урад абавязаўся няўхільна падтрымліваць парадак у тылу, як неад'емную ўмову перамогі.

Іспанскі друк адналушна вітае новы ўрад, які выказвае ўсе імкненні і надзеі народа і цвёрдую ўпэўненасць, што ён прывядзе рэспубліканскую Іспанію да хуткай і поўнай перамогі над фашысцкімі мяжежнікамі і інтэрвентамі.

ІСПАНСКІ НАРОД ПАДТРЫМЛІВАЕ УРАД НЕГРЫНА

ВАЛЕНСІЯ, 19 мая. (Інф. «Праўды»). Сёння апублікаваны шматлікія рэзалюцыі грамадскіх і прафесіянальных арганізацый, выражаючыя поўнае давер'е новаму ўраду.

Заявы і рэзалюцыі розных профсаюзаў, уваходзячых ва Усеагульны Рабочы Саюз, маюць асаблівае значэнне з прычыны адмоўнай пазіцыі, якую выканаўчы камітэт Усеагульнага Рабочага Саюза заняў у адносінах да новага габінета. Аб'яднані ВРС такіх пролетарскіх цэнтраў, як Астурыя і Біскайя (Більбао), выступілі з асуджэннем пазіцыі выканаўчага камітэта і безагаворачна падтрымліваюць новы ўрад. Буйнейшая арганізацыя Усеагульнага Рабочага Саюза — каталонская — таксама выказалася за падтрыманне ўрада. І, нарэшце, адна з самых магутных прафесіянальных аб'яднанняў Усеагульнага Рабочага Саюза — мадрыдская — выказалася самым рашучым чынам за падтрыманне ўрада народнага фронта.

Такім чынам выяўляецца, што выканаўчы камітэт у занятай ім пазіцыі не адбівае пункту гледжання асноўных прафесіянальных арганізацый.

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 18 мая. (БЕЛТА). Мадрыдская газета «Эль Ліберал», вітаючы новы ўрад, лічыць асабліва ўдалым назначэнне міністрам абароны Прыето, зарэкамендаваўшага сябе ў якасці міністра марскога флота і авіяцыі.

Орган рэспубліканскай левай «Палітыка» лічыць, што новы ўрад складзен з людзей, якія выражаюць усе імкненні і надзеі іспанскага народу. Асабліва высока газета ацэньвае новага старшыню совета міністраў Негрына і міністра абароны Прыето. Газета ўпэўнена, што рабочыя масы акажуць поўнае падтрыманне новаму ўраду.

Газета «Эль соль» называе новы ўрад самым здольным урадам Іспаніі.

Орган аб'яднанай сацыялістычнай моладзі «Аора» заклікае моладзь «жалезным кулаком разграміць усіх, хто будзе супраціўляцца новаму ўраду і перашкаджаць яго дзейнасці».

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Інтэрвенты і мяжежнікі, аснашчоныя германскай і італьянскай ваеннай тэхнікай, сканцэнтравалі буйныя сілы на ўчастку Аморэбіета (на паўднёвы ўсход ад Більбао) і павялі 18 мая моцную атаку на рэспубліканскія пазіцыі. Урадавыя войскі, заняўшы новыя горныя пазіцыі, збаронеными ад агню праціўніка, затрымалі наступленне. Бай ў гэтым раёне прадаўжаліся. Мяжежнікі нясуць вялікія страты.

У сектары Леона (астурыйскі фронт) мяжежнікі, атрымаўшы падмацаванне, перайшлі ў контратаку ў раёне Піко дэль Ахілья (на паўночны ўсход ад Леона), спрабуючы вярнуць страчаныя імі пазіцыі на горных перавалах Тарна і Сан-Ісідро. Завязаўся жорсткі бой, які цягнуўся некалькі гадзін. Пазіцыі некалькі раз пераходзілі з рук у рукі, але ў рэзультаце астурыйскім гарнякам удалося нанесці сакрушальны ўдар асноўнай групе наступаючых мяжежнікаў і прымусіць яе ўцякаць.

Урадавыя войскі прыступілі да ўмацавання занятых імі пазіцый і збірання кінутай фашыстамі зброі.

ПАТРАБАВАННІ НЕАДКЛАДНАЙ АДСТАЎКІ ЎРАДА ХААСІ

ТОКІО (сталіца Японіі), 19 мая. (БЕЛТА). Адбылася канферэнцыя дэлегатаў партый Мінсэйто і Сэйюкай (асноўных буржуазных партый парламента), на якой дасягнута, паводле слоў агенцтва Дамей Цусін, «поўнае адзінства погляду адносна неабходнасці прыняць сумесныя рашучыя меры супроць урада Хаясі».

У канферэнцыі прымала ўдзел па 8 прадстаўнікоў ад цэнтральных органаў абодвух партый.

Канферэнцыя, між іншым, пастанавіла ў бліжэйшыя дні выпусціць сумесную дэкларацыю з патрабаваннем неадкладнай адстаўкі ўрада. Прынята таксама рашэнне пачаць перагаворы аб супрацоўніцтве ў гэтых мэтах з астатнімі партыямі, прадстаўленымі ў ніжняй палаце парламента.

Міжнародная хроніка

* Агенцтва Эспань перадае з Мадрыда, што генерал Міяха, у суправаджэнні галоўнага палітычнага камісара Антона і некаторых членаў генеральнага штаба, аб'ехаў увесь мадрыдскі фронт. 19 мая раніцой генерал Міяха выехаў у Валенсію для гутаркі з новым міністрам нацыянальнай абароны Прыето.

* Совецкі лінкор «Марат», які знаходзіцца ў Спітхэдзе (Англія), прыцягвае да сябе агульную ўвагу. Лонданскі друк змяшчае разгорнутыя апісанні совецкага лінкора і расказвае яго гісторыю. У газетах адзначаецца праведзенае нядаўна паляпшэнне тэхнічнага абсталявання «Марата», выгодныя памяшканні для каманды і т. д.

* Агенцтва Сентраль ньюс паведамляе, што японцы самавольна захапілі кітайскія залатыя прыскі ў павеце Сіньлуньшань, у паўночнай частцы правінцыі Хэбэй (паўночны Кітай).

* Закончыўся з'езд «Таварыства прыяцеляў СССР» ва Францыі. З'езд выдзеліў новы камітэт таварыства, у які ўвайшлі Рамэн Ралан, міністр авіяцыі П'ер Кот, міністр аховы здароўя Сельє, сацыяліст Жыромскі, Вайян Кутур'е і інш.

* Паўстанне ў Албаніі (краіна на заходнім узбярэжжы Балканскага поўвострава) падаўлена. Албанскія ўрадавыя часці занялі цэнтр паўстання — Дэльвіне (недалёка ад албана-грэчаскай граніцы). Паўстаўшыя, адступаючы, перайшлі грэчаскую граніцу.

* Былы міністр замежных спраў Іспаніі Альварэс дэль Вайо (сацыяліст) будзе прадстаўляць іспанскі ўрад на пасяджэнні Совета Лігі нацый 24 мая.

„Гітлер супроць СССР"

Кніга «Гітлер супроць СССР» належыць пяру Эрнста Генры.

Кніга разглядзвае актуальныя, сацыяльныя і ваенныя пытанні міжнароднага жыцця. На аснове велізарнага фактычнага матэрыялу аўтар, не гледзячы на рад спрэчных палажэнняў, высунутых ім, выкрывае разбойніцкія планы германскага фашызма і дае яркі аналіз тых сіл, якія непазбежна прывядуць да краху гітлераўскага «крыжовага паходу на Ўсход» і гітлерызма ў цэлым.

Кніга Генры мае вялікую цікавасць для прыяцеляў міру і змагароў супроць фашызма ва ўсім свеце.

Кніга спачатку была выдана ў Англіі, адначасова з выданнем у СССР, кніга выходзіць у Злучаных Штатах Амерыкі, ва Францыі і Галандыі.



Канал Волга—Масква. НА ЗДЫМКУ: цеплаход «Вячэслав Молотов» (справа) і службовы катэр «Рылеев» у шлюзе № 1. (СФ).

ПІСЬМО ІСПАНСКІХ ПІОНЕРАЎ

ГОМЕЛЬ, 20 мая. (БЕЛТА). Вучні пятага класа першай гомельскай чыгуначнай сталінскай школы паслалі пісьмо іспанскім піонерам, якія адпачываюць у Артэку. Іспанскія піонеры прыслалі адказнае пісьмо. Яны пішуць:

— Мы вельмі задаволены, што прыехалі ў цудоўную і гасцінную краіну Совецкага Саюза. Калі вайна скончыцца і наша краіна будзе такой-жа свабоднай і моцнай, як ваш Саюз, мы будзем жыць і вучыцца таксама, як і вы.

Піонерскія арганізацыі жылі і працавалі пры фашыстах падпольна, бо іх праследавалі таксама як і дарослых. Сярод нас ёсць дзеці, якія не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць, хоць ім ужо па 10—11 год, бо іх бацькі жылі так бедна, што пасылалі іх працаваць, а не ў школу.

Амаль усе мы перажылі жахі бамбардыровак. На нашых вачах адбываліся баі ў паветры і страшна было, калі разрываліся бомбы. Некаторым з нас прышлося ўпякаць з гарадоў, захопленых фашыстамі.

Выехалі мы ўсе з Валенсіі, дзе сабралося шмат эвакуяваных і ўцёкшых дзяцей. Ехалі мы на параходзе 10 дзён. Прыехалі ў Ялту 30 красавіка, дзе нас сустрэлі кіраўнікі Артэка і шмат народу. А ў Артэку нас сустракалі вельмі ўрачыста рускія піонеры, якія там адпачывалі.

Нам у Артэку вельмі добра. У нас ёсць вялікі прыгожы парк. Шмат гульняў і цудоўнае мора. У школе займаемся толькі дзве гадзіны, астатні час адпачываем.

Мы падзелены на 4 атрады. У кожным атрадзе ёсць рускі важаты і іспанскі настаўнік. Усе мы працуем у дзіцячай тэхнічнай станцыі, у якой ёсць аддзяленні малявання, радыё, тэлефоннае, фото і авіямадэльнае. Большасць з нас хоча быць лётчыкамі.

Мы спадзяемся тут добра адпачыць і паправіцца.

З сяброўскім піонерскім прывітаннем. Шлем вам найлепшыя пажаданні.

Калектыў іспанскіх піонераў.

УДЗЕЛ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ АКАДЭМІІ У СКЛАДАННІ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

На адбыўшымся пасяджанні прэзідыума Акадэміі навук БССР было заслухана паведамленне старшыні Совета па вывучэнню вытворчых сіл БССР т. Шпенцэра. У прынятым рашэнні прэзідыум даручыў т. Шпенцэру ад імя Акадэміі быць прадстаўніком у Дзяржплане БССР на складанню плана трэцяй пяцігодкі. Сумесна з дырэктарамі інстытутаў Акадэміі яму даручана сабраць усе закончаныя работы ў Акадэміі навук, якія могуць служыць матэрыяламі для складання пяцігадовага плана.

У Акадэміі навук распрацаваны матэрыялы па плану трэцяй пяцігодкі па наступных галінах прамысловасці: энергетыка і электрыфікацыя БССР, хімічная, скурана-абутковая, мяса і мясапрадуктаў, дрэваапрацоўчая, цэлюлозна-папяровая, прыродныя рэсурсы (карысныя выкапні), па гідролізу торфу, па вытворчасці штучных кармоў для жывёлы (атрыманне кармовых дражджэй з ільняной кастры і торфу) і т. д.

Зараз інстытуты Акадэміі распрацоўваюць тэматыку для плана трэцяй пяцігодкі, якая будзе садзейнічаць паспяховай рэалізацыі гэтага плана.

СКАРЫСТАННЕ ТАРФЯНЫХ ШЛАКАЎ

У 1936 годзе на шклозаводзе імя Сталіна (Касцюкоўка) навукова-даследчым інстытутам прамысловасці БССР была пабудавана вопытная шлакаплавільная ўстаноўка для атрымання з тарфянога шлаку плітак чорнага аблiцовачнага шкла тыпа марбліта. Установка працуе ўжо каля года і разам з эксперыментальнай работай пачала выконваць заказы па пастаўцы прыгожых аблiцовачных плітак. Першы такі заказ зараз выконваецца для аблiцоўкі Кіеўскага вакзала ў сталіцы УССР.

Шкляныя пліткі, атрыманыя з тарфяных шлакаў, маюць рад пераваг перад шклянымі марбліта вымі пліткамі. Яны ў два разы таней марбліта, але адноль каўны па свайму знешняму выгляду і моцнасці.

РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ў РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ

У радзе раённых цэнтраў рэспублікі гэтым годзе ўступяць у эксплаатацыю новыя і рэканструяваныя прамысловыя прадпрыемствы. На шклоўскім, рэчыцкім, суражскім і добрушскім цагельных заводах змяняюцца напольныя печы на кольцамянскія, пасля чаго выпуск прадукцыі павялічыцца ў два разы. Днямі закончана рэканструкцыя копыльскага цагельнага завода. У гэтым годзе пачнецца будаўніцтва цагельна-чарапічнага завода ў Шклове, які будзе выпускаць 1 мільён чарапіцы і 2,5 мільёна штук цаглін у год. Пачнецца будаўніцтва цагельнага завода ў Грэску з выпускам 5 мільёнаў штук цаглін у год. Невялікія вапнавыя заводы будуць пабудаваны ў Багушэўску і Хоцімску.

У Плешчаніцах, Заслаўі і Копылі адкрываюцца майстэрні па апрацоўцы дрэва, у якіх будуць прымацца індывідуальныя заказы на выраб сталоў, крэслаў, гардэробных шафаў і т. д. Майстэрні такога-ж тыпу па металаапрацоўцы адкрываюцца ў Слуцку і Чэрвені. У 15 раёнах уступяць у эксплаатацыю раённыя гідраэлектрастанцыі. Усё гэта — далёкі няпоўны спіс новых прадпрыемстваў раённых цэнтрах рэспублікі.

Апрача таго ўрад БССР адпусціў 2,1 тыс. рублёў на развіццё ў раённых цэнтрах новых відаў вытворчасці, як гальванай, па вырабцы фізкультурнага інвентара і інш.

ЧЭСНАСЦЬ

Грэская раённая газета «Сталінец» паведамляе аб прыкладзе чэснасці, які праявіў касір Панкрашаўскага вінзавода тав. Лешчанка. У раённай ашчадкасе касірам Уласевічам было перадана вінаграду аблігацый другой пяцігодкі (выпуск 4 года) на суму 915 рублёў. Перададзены аблігацыі тав. Лешчанка звярнуў у ашчадкасе.

ТРЫ МІЛЬЁНЫ КВЕТАК

У аранжарэях Менскага трэста зялёнага будаўніцтва зацвілі гартэнзіі і прымулы. Зараз цвітуць розы і ландыш. Хутка распусцяцца тульпаны і бэг. Сёння аранжарэі трэста дадуць тры мільёны кветак для азелянення горада. Заключаны ўжо дагавары на азеляненне заводаў і фабрык горада, усяго на 700 тысяч і так. 400 тысяч кветак будуць высаджаны на скверах і вуліцах Менска. У прыступіць адзін мільён кветак.

РОЗЫГРЫШ ФУТБОЛЬНАГА „КУБКА СССР"

126 футбольных каманд Саюза аспавуць у гэтым годзе «кубак СССР» па футболу. Сярод іх 2 каманды Менскага таварыстваў «Дынамо» і «Спартак». 24 мая па многіх гарадах Саюза адбудуцца першыя ігры розыгрыша. Менская «Дынамо» ў гэты дзень сустрэнецца з сваім сталіцёне з мацнейшай камандай Саюза — маскоўскім «Дынамо». Менскі «Спартак» у той-жа дзень грае ў Ленінградзе з камандай Іжорскага завода.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Аддзел кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б выклікае на 25 мая (пакой № 1) нижэйнаступных таварышоў: Песляк В. І., Фінкель М. І. (Варашылаўскі горрайком); Бокун М. М. (Сталінскі горрайком); Праваловіч А. С. (Бабруйск); Драпаў І. І. (Лельчыцы); Суцкевер О. Г. (Пухавічы); Альшэўскі П. К. (Дрыса); Круглоў І. І. (Глуск); Пілішенка П. А. (Касцюковічы); Зенковіч І. С. (Сураж); Крышталь А. Г. (Чэрвень); Лешчэўская А. Г. (Лепель); Матусевіч В. І. (Бягомль).

Загадчык АКПО ЦК КП(б)Б РУБІНШТЭЙН.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

25 МАЯ
ПЕРШЫ ТЫРАЖ
ВЫИГРЫШАЎ ПАЗЫКІ
ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ
(ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА)

АСОБЫ, ЯКІЯ НЕ АБМЯНЯЛІ АБЛІГАЦЫІ РАНЕЙ ВЫПУШЧАНЫХ МАСАВЫХ ДЗЯРЖПАЗЫК НА АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (ВЫПУСК 4 ГОДА) У АРГАНІЗАВАНЫМ ПАРАДКУ, МОГУЦЬ АБМЯНЯЦЬ ІХ ВА ЎСІХ ПЭНТРАЛЬНЫХ, РАЁННЫХ АШЧАДКАСАХ І АШЧАДКАСАХ ПЕРШАГА РАЗРАДА.

АСОБЫ, ЯКІЯ НЕ АБМЯНЯЛІ СВАЕ АБЛІГАЦЫІ, ТРАЦЯЦЬ ПРАВА НА ЎДЗЕЛ У ПЕРШЫМ ТЫРАЖЫ ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (ВЫПУСК 4 ГОДА), ЯКІ НАЗНАЧАН НА 25 МАЯ Ў МАСКВЕ.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

СЁННЯ 21 мая на рагу вул. Комуністычнай і Энгельса
АДКРЫВАЕЦЦА
КАФЭ ЛЕТА

У ПРОДАЖЫ:
МАРОЖАНАЕ
ПІВА
БЕЗАЛКАГОЛЬНЫЯ НАПІТКІ
ГАЗІРОВАНАЯ ВАДА з НАТУРАЛЬНЫМІ СІРОПАМІ і розныя ЗАКУСКІ
Павільён будзе адкрыт штодзённа з 11 г. раніцы да 2 гадзін ночы.
КАНТОРА МЕНЛАРКА МЕНГОРХАРЧГАНДЛЯ.

Дзеннік

— Семінар рэдактароў шматтыражак насценных газет Менска адбудзецца 21 мая ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва, пакой 20.

— Менгарком КП(б)Б просіць былога студэнта ВКСГПБ Камароўскага А. І. паведаміць свой адрас.

Тт. Васіленка М. Л., Даватор А. В., Гарбацэвіч Н. Л., Карасік Х. Х. Шлепкін С. Я. і Вдовіна А. М. выклікаюцца ва ўчотны аддзел Сталінскага райкома.

ЛЕКТОРЫЙ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ
(Комсамольская, 25).
23 мая ў 8 гадзін 30 мінут вечара для гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і стаханаўцаў адбудзецца лекцыя майора т. Гудая на тэму:
„БУДУЧАЯ ВАЙНА"
Запрашальныя білеты на прадпрыемствах. Продаж білетаў у канцылярыі Дома тэхнікі з 2 да 4 гадзін дня.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР (БДДТ)
21 мая Абан. № 118.
СКУПЫ
Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
21 мая Абан. № 43.
ФЛОРЫЯ ТОСКА
Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» ТРЫНАЦЦАЦЬ
на летняй эстрадзе Канцэрт. аддзела.
Гукавы кінатэатр «Пролетарый» АЛМАС
на летняй эстрадзе — джаз-аркестр
Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» «ПЕТЭР»
Гукавы кінатэатр «Спартак» ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ ПЕТРА ВІНАГРАДАВА

ЦЭНТРАЛЬНЫ УНІВЕРМАГ КУЛЬТТАВАРАЎ
БЕЛПРОМГАНДЛЯ
Менск, Совецкая, 43
ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ:
МАТАЦЫКЛЫ ў 6 СІЛ, ЗАВОДА «КРАСНЫЙ ОКТЯБРЬ» ЦАНА 7080 РУБ.
КАСЕТЫ ЖАЛЕЗНЫЯ, ЦАНА 355 р. і 609 р.
ШАФЫ НЕЗГАРАЕМЫЯ РОЗНЫХ ТЫПАЎ ЦАНА 793 р., 1397 р., 2070 р. і 3250 р. З ПАДСТАЎНОЙ ШАФАЙ.
ШКАТУЛКІ НЕЗГАРАЕМЫЯ ЦАНА 202 р. і 223 р.
ІНШАГАРОДНІЯ ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА ПА АФІЦЫЙНЫХ ЗАПАТРАБАВАННЯХ БЕЗАДКЛАДНА.
ДЫРЭКЦЫЯ УНІВЕРМАГА.
У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

БЕЛДЗЯРЖКІНО тэрмінова патрабуюцца ШОФЕРЫ для работы на палутарках.
Звяртацца з 9 да 3 г. дня— Совецкая, 90, другі паверх, пакой № 13, Белдзяржкіно.

РЭДАКЦЫІ «ЗВЯЗДЫ» патрэбны машыністкі на дзённую і вячэрнюю работу.
Звяртацца па тэл. № 20-830, ці непасрэдна ў сакратарыят (трэці паверх).

Украдзена круглая пячатка ваўкома Пухавіцкага ільнозавода профсаюза рабочых ільняной прамысловасці БССР. Лічыць несапраўднай.

МЕНСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. М. ГОРКАГА
абвяшчае ПРЫЁМ на 1937-1938 навучальны год
на наступныя факультэты: гістарычны, геаграфічны, літаратуры і мовы дашкольны, замежных моў—нямецкае, англійскае і французскае аддзяленні, на яўрэйскую і польскую секцыі літаратурнага і гістарычнага факультэтаў.
Інстытут рыхтуе выкладчыкаў для сярэдніх школы, тэхнікумаў і рабфакаў.
У інстытут прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 35 год з законченай сярэдняй адукацыяй (дзесяцігодка, тэхнікум, рабфак) або атрымаўшыя атэстат аб скончанні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.
Незалежна ад адукацыі паступаючыя падвяргаюцца іспытам ў аб'ёме сярэдняй школы па рускай і беларускай мовах (пісьмовы твор, граматыка і літаратура), палітграмаце, матэматыцы, фізіцы, хіміі і па адной з замежных мо (англійскай, нямецкай або французскай—па выбару паступаючага).
Паступаючыя на яўрэйскую і польскую секцыі падвяргаюцца іспытам на яўрэйскай і рускай або польскай і рускай мовах.
УВАГА. Скончыўшыя сярэднюю школу (дзесяцігодку) і маючыя на ноўных прадметах адзнакі «выдатна», а па астатніх прадметах адзнаку не ніжэй «добра», прымаюцца ў інстытут без прыёмных іспытаў. Гэта права распаўсюджваецца і на скончыўшых сярэднюю школу ў парадку экстэрната.
Заявы падаюцца на імя дырэктара МПІ з прадстаўленнем наступных дакументаў: аўтабіяграфіі, атэстата аб скончанні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале), пашпарта (прад'яўляецца пры асабістай яўцы), фатаграфічных картак (здымкі без галаўных убораў), з уласнаручным пісам паступаючага на кожнай з іх, завераныя дзярж. установай, і дадатковых аб адносінах да воінскай павіннасці (для ваеннаабавязаных).
УВАГА. У заяве трэба ўказаць, які факультэт і спецыяльнасць паступаючы выбірае, а таксама падрабязны адрас.
Прыём заяў аб залічэнні праводзіцца з 1 ліпеня па 1 жніўня 1937 года.
Прыёмныя іспыты праводзяцца з 1 па 20 жніўня, а залічэнне ў ліку студэнтаў — з 21 па 25 жніўня.
Іншагародніх студэнты забяспечваюцца інтэрнатам. Стыпендыя — у залежнасці ад паспяховасці.
Членам сям'і студэнтаў інтэрнат не прадастаўляецца.
Заявы падаваць па адрасу: г. Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны пус, канцылярыя МПІ, пакой 2-30.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № К—2103. Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63. К., К., С.